ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 СНЕЖНЯ 2012 г. ЧАЦВЕР № 235 (27350) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Ці часта сярэднестатыстычнаму беларусу даводзіцца сустракацца з роднай мовай у рэальным жыцці? Відаць, не вельмі, калі чалавек не чытае беларускамоўных газет і часопісаў і не мае сяброў, якія размаўляюць па-беларуску. А калі зазірнуць у інтэрнэт?

# БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ СТАРШЫНСТВАВАЦЬ У СНД У 2013 ГОДЗЕ




Фота БЕЛТА.

**Беларусь афіцыйна аб'яўлена старшынёй СНД у 2013 годзе. Адпаведнае рашэнне прынята на пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці, якое прайшло ў Ашхабадзе, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«На пасяджэнні Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД у вузкім складзе прынята рашэнне, што з 1 студзеня 2013 года старшынства ў СНД пераходзіць да Рэспублікі Беларусь», — заявіў Прэзідэнт Туркменістана Гурбангулы Бердымухамедаў, адкрываючы пасяджэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў у пашыраным складзе.

Як адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, Садружнасць з'яўляецца адным з прыярытэтных вектараў знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц СНД. «Таму беларускае старшынства пройдзе пад дэвізам «Інтэграцыя на карысць чалавека: умацаванне добрасуседства, развіццё экалагічнага супрацоўніцтва, пашырэнне дыялогу культур», — сказаў Прэзідэнт Беларусі. Ён таксама адзначыў, што 2013-ты абвешчаны Годам экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя ў СНД. «Мы будзем зыходзіць з уліку інтарэсаў усіх дзяржаў — удзельніц Садружнасці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Акрамя таго, Прэзідэнт расказаў аб тых кірунках, на якіх беларускі бок у 2013 годзе прадугледжвае акцэнтаваць увагу. Гэта развіццё агульнай інфармацыйнай прасторы, умацаванне міжкультурнага і міжэтнічнага ўзаемадзеяння, пашырэнне кантактаў на ўзроўні навуковай і творчай інтэлігенцыі, ветэранскіх і моладзевых арганізацый, рэалізацыя праектаў у галіне экалагічнай культуры і аховы навакольнага асяроддзя. «Гэтую тэму асабліва актуалізаваў Прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч, запрасіўшы кіраўнікоў дзяржаў на пляцоўку Чарнобыля, дзе сёння ўзводзіцца ўнікальнае збудаванне — сховішча рэактара, на якім адбылася катастрофа», — адзначыў Прэзідэнт Беларусі.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, беларускі бок да канца 2012 года прадставіць канцэпцыю беларускага старшынства і план мерапрыемстваў па яе рэалізацыі. «Я вельмі спадзяюся на вашу падтрымку і гатоўнасць да сумеснай працы па ўмацаванні Садружнасці ў інтарэсах нашых народаў», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі таксама выказаў падзяку туркменскаму боку і асабіста Прэзідэнту Гурбангулы Бердымухамедаву за праведзеную ў перыяд старшынства ў СНД працу, а таксама за сардэчны прыём у Ашхабадзе. «У выдатнай туркменскай сталіцы сёлета праходзілі не толькі афіцыйныя пасяджэнні органаў Садружнасці, але таксама адбыўся шэраг навуковых, творчых, спартыўных і іншых мерапрыемстваў. Яны паслужылі ўмацаванню традыцыйна дружалюбных сувязяў паміж народамі нашых краін», — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы.

❑❑❑

Перад пачаткам пасяджэння Савета кіраўнікоў дзяржаў Садружнасці адбылася двухбаковая сустрэча прэзідэнтаў Беларусі і Туркменістана Аляксандра Лукашэнкі і Гурбангулы Бердымухамедава. Абодва кіраўнік дзяржаў пацвердзілі намер паглыбляць плённае супрацоўніцтва ў розных сферах.

СТАР. 2

## Добрая навіна

### Беларусы лепш за ўсіх у СНД забяспечаны асабістымі аўто

**Беларусь займае лідзіруючае месца ў СНД па забяспечанасці насельніцтва ўласнымі легкавымі аўтамабілямі, паведаміла карэспандэнту БелТА прэс-сакратар Нацыянальнага статыстычнага камітэта Вольга Клаўсуць.**

Так, на пачатак гэтага года ў нашай краіне на 1000 жыхароў прыпадала 280 аўтамабіляў у асабістай уласнасці грамадзян. Гэты паказчык у Расіі быў 242, у Казахстане — 203, ва Украіне — 143, у Кыргызстане — 64. З 2000 года забяспечанасць насельніцтва Беларусі ўласнымі легкавымі аўтамабілямі вырасла ўдвая. Так, у 2000 годзе на 1000 чалавек насельніцтва краіны было 139 асабістых аўто, у 2005-м — 180, у 2008-м — 230, 2009-м — 246, у 2010-м — 264.

Такія звесткі змяшчаюцца ў зборніку «Беларусь і краіны СНД». У ім прадстаўлена статыстычная інфармацыя аб сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі ў параўнанні з іншымі краінамі СНД за перыяд з 2000-га па 2011 год.

## ЛІЧБА ДНЯ

***Br3 млн 590,1 тыс.***

*склала ў студзені—кастрычніку гэтага года намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата работнікаў у цэлым па рэспубліцы. У тым ліку ў кастрычніку — Br4228,4 тыс. Гэта $494,3 у эквіваленце. Тэмпы росту заработнай платы за студзень—кастрычнік склалі 201,5%, што вышэй за тэмпы росту, прадугледжаныя прагнозам на 2012 год (171,4-172%), у тым ліку за кастрычнік — 182,5%.*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | –4° |
| Віцебск | –2° |
| Гомель | –1° |
| Гродна | –4° |
| Магілёў | –2° |
| Мінск | –1° |

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.12.2012 г.

| | |
|---|---|
| Долар ЗША | 8590,00 ▲ |
| Еўра | 11260,00 ▲ |
| Рас. руб. | 278,50 ▲ |
| Укр. грыўня | 1049,29 ▲ |

ISSN 1990 - 763X

## Расклад на заўтра

### СКЛАДНІКІ БЕРАЖЛІВАСЦІ

#### 2013-ы аб'яўлены ў Беларусі Годам беражлівасці

**Што і дзе можна і трэба эканоміць? Размова ідзе пра эканомію энергіі і рацыянальнае выкарыстанне рэсурсаў, аптымізацыю выдаткаў, удасканаленне арганізацыі вытворчасці, павелічэнне прадукцыйнасці працы, у тым ліку за кошт мадэрнізацыі, новых тэхналогій і тэхнікі, спосабаў гаспадарання. Прычым да ўсяго гэтага неабходна дадаць імкненне да гаспадарлівасці і беражлівасці кожнага з нас у паўсядзённым жыцці. Новыя прадпрыемствы закладаюць эканомію ў свае інфраструктуры. У Магілёве, напрыклад, замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «ВМГ Індустры» ўзводзіць вялікі комплекс па вытворчасці ДСП і корпуснай мэблі. Там прадугледжана кацельня, якая будзе працаваць на адходах вытворчасці. Кавалкі драўлянай пліты і нават пыл са шліфоўкі можна было б выкідаць на сметнік, але адходы пойдуць у справу. З такой кацельняй і замкнёным цыклам перапрацоўкі драўніны можна атрымаць значную эканомію.**

СТАР. 3

## Побач з намі

### КАМУ НА ПЕНСІІ ЖЫВЕЦЦА ВЕСЕЛА?

**84-гадовая Эстэр і 85-гадовы Марцін Кафер з Канады сталі самай пажылой сямейнай парай, у якой атрымалася ўзысці на Кіліманджара. 94-гадовы Рамджыт Рагхав стаў самым старым бацькам у свеце. Самай пажылой мадэллю, якая ўсё яшчэ працуе, прызнана 80-гадовая амерыканка Кармэн Дэл'Арэфіс. 106-гадовы Ёханес Хеестэрс лічыцца самым старым дзейным акцёрам у свеце. А яшчэ — 22 працэнты актыўных карыстальнікаў сацыяльных сетак — людзі, якія перасягнулі 60-гадовую мяжу. Пажылыя блогеры ў сярэднім робяць адзін запіс на тыдзень.**

Падборку цікавых фактаў з жыцця «забугорных» дзядкоў адшукала ў інтэрнэце ўсяго за дзесяць хвілін. Падобных гісторый пра жыццё нашых пажылых людзей не так ужо і шмат. Большасць са СМІ пішуць аб праблемах хворых і нямоглых, якія страцілі цікавасць да жыцця. Нават фотаздымкі нашых і замежных пенсіянераў адрозніваюцца ашаламляльна. У чым жа справа? Што з нашымі дзядулямі і бабулямі не так?

СТАР. 4

## Служба дні і ночы

### РАССЛЕДУЕЦЦА СПРАВА

**У вытворчасці падраздзяленняў упраўлення Следчага камітэта па Гомельскай вобласці за 10 месяцаў гэтага года знаходзілася больш за 17 тысяч крымінальных спраў. Следчымі нярэдка выкрываюцца заблытаныя справы, у якіх, на першы погляд, спачатку не было перспектыў. Вось адна з іх.**

*Цела невядомага мужчыны рыбакі знайшлі раніцай у канцы кастрычніка ў рацэ Днепр. Пяць нажавых раненняў не пакінулі сумненняў, што грамадзянін стаў ахвярай злодзея. Але ж, каб знайсці апошняга, трэба было высветліць асобу пацярпелага.*

*Намеснік начальніка ўпраўлення Следчага камітэта РБ па Гомельскай вобласці Юрый Дзям'янчык расказвае, што менавіта тэрміновае высвятленне асобы і стала першай кропкай адліку, пасля чаго стала паступова разгортвацца стужка падзей — апошніх гадзін жыцця жыхара Жлобіна Н.:*

— Справа ў тым, што заяў у следчыя органы аб пошуку прапаўшага не паступала. Праверка адбіткаў пальцаў вынікаў таксама не дала: не праходзіў ён па дактыласкапічнай базе. Тады супрацоўнікамі ўпраўлення крымінальнага вышуку былі зроблены арыенціроўкі з фотаздымкам цела і распаўсюджаны сярод жыхароў навакольных вёсак. Гэта хутка прынесла вынікі: асобу чалавека высветлілі.

СТАР. 2

# БЕЛАРУСЬ БУДЗЕ СТАРШЫНСТВАВАЦЬ У СНД У 2013 ГОДЗЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Вітаючы Аляксандра Лукашэнку, Прэзідэнт Туркменістана падкрэсліў высокую дынаміку ў развіцці беларуска-туркменскіх адносін і традыцыйна дружалюбныя і цесныя сувязі паміж народамі дзвюх краін. Па словах Гурбангулы Бердымухамедава, бакі актыўна супрацоўнічаюць у сферы палітыкі, набіраюць абароты гандлёва-эканамічныя сувязі. У гэтым плане ён адзначыў дзейсную работу міжурадавай камісіі. Прэзідэнт Туркменістана таксама падзякаваў кіраўніку беларускай дзяржавы за плённае ўзаемадзеянне ў пытаннях адукацыі, навукі, абмену вопытам. Ён адзначыў, што ў Туркменістане ў многіх галінах запатрабавана беларуская тэхніка, якая ў тым ліку выкарыстоўваецца ў сельскай гаспадарцы, нафтагазавай галіне.

Асаблівы акцэнт Прэзідэнт Туркменістана зрабіў на развіцці культурна-гуманітарных сувязяў. Так, нядаўна ў Белдзяржцырку прайшлі гастролі групы «Туркменскія джыгіты» Дзяржаўнага цырка Туркменістана. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Гурбангулы Бердымухамедаву за фурор, зроблены ў Беларусі артыстамі цырка Туркменістана. «Вы сапраўды паказалі вышэйшы клас у цэнтры Еўропы. Нам хацелася б, каб гэтых прадстаўленняў было больш», — сказаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Акрамя таго, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў наяўнасць вялікіх перспектыў для развіцця ў будучыні Гарлыкскага горна-абагачальнага камбіната. «Запасы калійных угнаенняў у вас каласальныя. Упэўнены, што вы іх будзеце развіваць, — сказаў Прэзідэнт Беларусі. — Таму і ў нас працы тут хопіць разам з вамі».

■ Для людзей

# Сацыяльны работнік — не толькі прафесія

**У Мар'інай Горцы адбыўся агляд-конкурс прафесійнага майстэрства «Лепшы сацыяльны работнік-2012». Такія мерапрыемствы сталі тут ужо традыцыйнымі і з'яўляюцца лагічным падвядзеннем вынікаў работы за год.**

Конкурсы праводзяцца не «дзеля плана». Яны маюць на мэце вызначыць ступень прафесійнага майстэрства сацыяльных работнікаў, павысіць культуру абслугоўвання, а таксама прэстыж гэтай нялёгкай прафесіі.

Сапраўды, несці ношу сацыяльнага работніка здольны не кожны. У асноўным у гэтай сферы працуюць жанчыны. Яны дапамагаюць пажылым людзям, сярод якіх — адзінокія і тыя, хто пражывае адзін. І да кожнага трэба знайсці падыход, кожнаму сказаць добрае слова, дапамагчы па гаспадарцы, забяспечыць прадуктамі харчавання, лекамі, прыбраць хату, прыгатаваць абед, прынесці вады і скласці ў павець дровы. Прычым гэта толькі невялікая частка абавязкаў сацыяльнага работніка.

Сёлета канкурсанткі змагаліся ў чатырох намінацыях: «Візітная картка», «Кулінарны паядынак», «Экспрэс-экзамен», «Новыя формы работы». Конкурс праходзіў ярка, насычана і весела.

Бясспрэчна, нялёгка было членам журы аддаць перавагу камусьці аднаму. Яны шмат спрачаліся, але прыйшлі да згоды: тытул лепшага сацыяльнага работніка 2012 года прысвоілі Ірыне Янковіч. Ну а пераможцамі па выніках работы за год сярод брыгадзіраў і інспектараў сталі адпаведна Алена Дыдзік і Вера Кураленка.

Адышлі ў мінулае хваляванні, трывогі і нават слёзы канкурсантак. Але ў памяці ўдзельнікаў і гледачоў застанецца добразычлівая і вясёлая атмасфера свята. Менавіта такая праца сацыяльнага работніка: радасная і крыху журботная. І, як глыток вады, неабходная для адзінокіх старых.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ** ■

# ЛАЎРЭАТЫ, СТЫПЕНДЫЯТЫ І ДЫПЛАМАНТЫ СПЕЦФОНДУ ПРЭЗІДЭНТА ДАДУЦЬ КАНЦЭРТ У МІНСКІМ МУЗТЭАТРЫ

**Эстрадны канцэрт лаўрэатаў, стыпендыятаў і дыплamantаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі пройдзе 7 снежня ў Беларускім дзяржаўным акадэмічным музычным тэатры. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў Міністэрстве культуры Беларусі.**

Сцэна музтэатра збярэ лепшых прадстаўнікоў таленавітай моладзі. Удзельнікі канцэрта — маладыя таленавітыя вакалісты, танцоры, артысты цыркавога жанру, пераможцы буйнейшых міжнародных конкурсаў, такіх як «Славянскі базар у Віцебску», «Дзіцячая новая хваля», «Залаты мікрафон», «Еўрабачанне», маладзевыя Дэльфійскія гульні.

Пётр Ялфімаў, Інга Кісялёва, Лідзія Забалоцкая, Хрысціна Святлічная, Аляксандр Няхай, Марыя Новік, Міхаіл Ліла, Максім Пісарэнка, Настасся Васільева — лаўрэаты спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па падтрымцы таленавітай моладзі — прадставяць вакальнае майстэрства.

Вучні ўзорнай цыркавой студыі «Арэна» з Мазыра пад кіраўніцтвам Марыі і Барыса Кузняцовых парадуюць гледачоў яркімі акрабатычнымі нумарамі.

Сучасную харэаграфію прадставяць студэнты Беларускага дзяржаўнага харэаграфічнага гімназіі-каледжа і калектыў кафедры харэаграфіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва пад кіраўніцтвам Святланы Гуткоўскай.

У канцэрце таксама прагучыць джаз у выкананні дыпламантаў спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі біг-бэнда «Teen Time» дзіцячай музычнай школы №14.

Віртуознае выканальніцкае майстэрства прадэманструе ансамбль скрыпачоў «Капрыс» Мінскага музычнага каледжа імя М. Глінкі.

Арганізатары канцэрта — Міністэрства культуры Беларусі, Спецыяльны фонд Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, Інстытут культуры Беларусі, Беларускі дзяржаўны акадэмічны музычны тэатр.

■ У свеце

# ПАМЕРЛА САМАЯ СТАРАЯ ЖЫХАРКА ЗЯМЛІ

**Амерыканка Бес Купер памерла 4 снежня на 117-м годзе жыцця ад страўнікавай інфекцыі ў доме састарэлых. Купер стала самай старой жыхаркай Зямлі ў студзені 2011 года, калі ва ўзросце 114 гадоў памерла амерыканка Юніс Сэнбарн.**

У сувязі са смерцю Купер тытул самага старога жыхара планеты перайшоў да Дзіны Манфрэдзіні, 115-гадовай амерыканкі італьянскага паходжання. Самы пажылы мужчына на планеце — японец Дзіраэмон Куміра — маладзейшы за Манфрэдзіні на два тыдні.

**БЕЛТА.**

## Назначэнне

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка назначыў палкоўніка Сяргея Труса начальнікам Галоўнага штаба — першым намеснікам камандуючага Ваенна-паветранымі сіламі і войскамі проціпаветранай абароны Узброеных Сіл.

Извещение о созыве и проведении
внеочередного Общего Собрания акционеров ОАО «Технобанк»

*Наименование и место нахождения Банка:* Открытое акционерное общество «Технобанк», место нахождения: 220002, г. Минск, ул. Кропоткина, 44.

*Дата, время и место (с указанием адреса) проведения Общего Собрания акционеров:* 12 декабря 2012 года с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, ОАО «Технобанк», 2-й этаж; дата, время и место регистрации лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании акционеров: 12 декабря 2012 года с 13.30 до 14.00 по месту проведения Общего Собрания акционеров.

*Повестка дня Общего Собрания акционеров:*

1. О выпуске облигаций ОАО «Технобанк».
2. Об условиях договора с аудиторской организацией.
3. О внесении изменений в Устав ОАО «Технобанк».
4. О выкупе ОАО «Технобанк» акций собственного выпуска по требованию акционеров ОАО «Технобанк».
5. О решениях органов управления ОАО «Технобанк» за 2012 год.

*Орган Банка или иные лица, созывающие Общее Собрание акционеров, основание его созыва:* акционер ОАО «Технобанк» Курач И.А., обладающий не менее чем десятью процентами голосов от общего количества голосов акционеров банка, основание созыва – собственная инициатива, требование указанного акционера в соответствии с частью четвертой статьи 49 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах».

*Порядок ознакомления лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании, с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению этого собрания, с указанием адреса, по которому можно с ней ознакомиться*: предоставление для ознакомления информации (документов), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, осуществляется в ОАО «Технобанк» по адресу: г. Минск, ул. Кропоткина, 44, на основании письменного запроса (на имя Председателя Правления ОАО «Технобанк») лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании акционеров и(или) их уполномоченных представителей.

*Порядок регистрации лиц, имеющих право на участие в Общем Собрании:* регистрация лиц, имеющих право на участие в общем собрании: с 13.30 до 14.00 по месту проведения собрания при предъявлении документов, подтверждающих их личность (паспорт) и полномочия представителей акционеров (документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; доверенность).

*Иные сведения, предусмотренные уставом хозяйственного общества и (или) решением о проведении общего собрания участников хозяйственного общества:* ОАО «Технобанк» выдана лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 11 от 31.05.2010; УНП ОАО «Технобанк» – 100706562.

# РАССЛЕДУЕЦЦА СПРАВА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Пенсіянер N. жыў у адной з вёсак Жлобінскага раёна. А ў Вялікія Рагі прыязджаў як на дачу, бо тут у яго таксама быў дом з майстэрняй. Мясцовыя расказалі, што апошні раз прыехаў па просьбе — дапамагчы суседу памяняць дзвярныя і аконныя блокі. Тое, што мужчыну ніхто не шукаў, — не дзіўна. З жонкай ён быў у разводзе, а дочкі, якія жывуць асобна, штодзень не цікавіліся жыццём бацькі.

Следчыя дакладна высветлілі, што са Жлобіна ў Вялікія Рагі N. паехаў 22 кастрычніка, і пасля гэтага ніхто са сваякоў яго не бачыў. Праваахоўнікі сканцэнтраваліся вакол яго сувязяў у вёсцы — асноўнай версіяй стала магчымасць забойства кімсьці з мясцовых жыхароў. Не выключалі, што адбылася трагедыя ў момант канфлікту пасля ўжывання алкаголю. Была атрымана інфармацыя, што мужчына хоць і не злоўжываў, але ж не адмаўляўся выпіць.

— У нашай працы немалаважна ўзаемадзеянне следчых і аператыўных службаў, — падкрэслівае Юрый Аляксеевіч. — Важна размеркаваць людзей, каб адпрацоўваць кожную з версій, зразумець, якая версія правільная, і далей у хуткім тэмпе працаваць разам.

Было ўстаноўлена, што ў апошні дзень ахвяру бачылі каля крамы разам з грамадзянінам, якога адразу ж затрымалі па падазрэнні ў здзяйсненні злачынства. Судзімы за пакушэнне на забойства сваёй жонкі, а потым і за пагрозы забойствам, ён нідзе не працаваў і ўвогуле меў дурную славу. Яго дапрасілі ў якасці падазронага. Аднак той упэўнена заявіў, што нікога не забіваў. Следчыя ўсё ж арганізавалі падрабязны агляд жылля падазронага, у выніку знайшлі невялічкія крапелькі крыві. Хутчэй за ўсё, забойца спачатку хаваў цела ў адрыне. Пры вобыску ў яго доме знайшлі ўласныя рэчы N: тэлефон, ключы і капялюш. Тым не менш грамадзянін настойваў, што N. забыў свае рэчы падчас сумеснага ўжывання алкаголю.

— Пакуль бы мы атрымалі заключэнне экспертызы наконт таго, каму належаць выяўленыя сляды крыві, прайшоў бы мінімум тыдзень, — працягвае расказ Юрый Дзям'янчык. — Таму сталі шукаць іншыя доказы. Якім чынам цела магло быць вывезена на 2 км вышэй па цячэнні ракі Днепр? Разважалі: калі па вадзе — плыць трэба было б супраць цячэння, па старых рэчышчах, абыходзіць вельмі далёка... Таму вырашылі, што злодзей выкарыстоўваў нешта накшталт аўтамабіля. Пачалі высвятляць, у каго з яго знаёмых ёсць падобная тэхніка. Практычна адразу нам паказалі на пляменніка, у якога меўся міні-трактар з невялікім прычэпам. Па месцы жыхарства мужчыны трактара не аказалася. Пляменнік адказаў, што сельгасагрэгат часова забраў бацька (ён жа — родны брат падазронага). Так узнікла меркаванне, што браты разам вывозілі ноччу цела забітага. Следчыя зноў накіраваліся на той самы бераг ракі, дзе ляжала цела, і адразу ж знайшлі сляды шын, якія вельмі нагадвалі пратэктары міні-трактара.

Адбылася размова следчага з жонкай брата падазронага. Жанчына расказала, што муж з братам той ноччу вярнуліся разам п'яныя. Ёй муж аддаў залаты крыжык з ланцужком — на продаж. Калі пазней ювелірны выраб паказалі сваякам забітага, яны без сумнення заявілі, што ўпрыгажэнне належала менавіта яму.

Пасля гэтага ўжо не вытрымаў брат падазронага. Ён сазнаўся, што дапамагаў вывезці цела забітага на бераг Дняпра. Цяпер і сам грамадзянін, якога падазравалі, пад націскам неабвержных доказаў звярнуўся з заявай аб чыстасардэчным прызнанні. Аднаго так і не ўспомніў забойца — прычыны канфлікту, з якога пачалася п'яная сварка, што прывяла да трагедыі.

Вынікі адной з праведзеных следчымі экспертыз паказалі, што мужчыну, якому было нанесена 5 нажавых раненняў, памёр не адразу. Хутчэй за ўсё, ён праляжаў некалькі гадзін у адрыне, паступова сыходзячы крывёй. У крыві аказаліся і дошкі невялікага прычэпа, у якім ахвяру везлі да ракі.

— Наша следчая група ў першы дзень вызначыла асобу, якая здзейсніла забойства, і сабрала асноўныя доказы віны літаральна на працягу двух сутак, — адзначае намеснік Юрый Дзям'янчык. — Сёння гэты грамадзянін знаходзіцца пад вартай і чакае суда. Яму прад'яўлена абвінавачанне па артыкуле аб наўмысным забойстве. З улікам папярэдніх судзімасцяў яму могуць прысудзіць да 25 гадоў пазбаўлення волі, пажыццёвае зняволенне і нават смяротнае пакаранне.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

**Считать недействительными** страховые полисы ФСООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0383793, 0452289; квитанцию о приеме наличных денежных средств (страховых взносов) формы 1-СУ серии КС № 0894640, 0617725, 0897733, серии КВ № 4114485; по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС № 7318808, серии ВР № 0552855; универсальный страховой полис 2РН, 2РП серии БК № 0113684, страховой полис по добровольному страхованию транспортных средств формы 2РН, РП серии БТ № 006699.

**Выказваем глыбокае спачуванне родным і блізкім, калектыву адкрытага акцыянернага таварыства «Грыцкевічы» ў сувязі з сыходам з жыцця кіраўніка гэтага калектыву Уладзіміра Уладзіміравіча МАЛАХВЕЯ, які быў шчырым сябрам нашай газеты і партнёрам. У апошнім сваім інтэрв'ю «Звяздзе», змешчаным 17 лістапада, ён казаў: «Нялёгкая і надзвычай адказная справа выпала нам (г. зн. сельскім працаўнікам. — Рэд.), ці, дакладней, выбралі яе мы самі. Вечная гонка за часам, каб усё паспець, за надвор'ем, якое ніяк не жадае лічыцца з нашымі планамі і задумамі. Але інакш нам і нельга: менавіта мы адказваем за харчовую бяспеку краіны...». Усё свядомае жыццё Уладзіміра Уладзіміравіча было выдатным прыкладам добрасумленнага служэння сялянскай справе, а калектыў таварыства «Грыцкевічы» пад яго кіраўніцтвам дасягнуў у гэтай справе сапраўдных вышынь.**

■ На слыху

## ВЫРАТАВАЛІ ТРОХ РЫБАКОЎ. АДЗІН НЕ ВЫЖЫЎ...

**На Дняпры каля Лоева бліжэй да вечара адбылася трагедыя: тут перакулілася лодка з рыбакамі. Нягледзячы на тое, што трох чалавек выратавальнікі АСВОДа даволі аператыўна паднялі з вады, адзін з пацярпелых потым памёр у бальніцы.**

Пра здарэнне ў МНС паведаміў відавочца. Ён жа сказаў, што людзям, якія знаходзяцца ў вадзе, патрэбна дапамога. Да месца надзвычайнай сітуацыі тут жа былі накіраваны падраздзяленні службаў 101, 103 і АСВОДа. Менавіта работнікі АСВОДа першымі прыбылі на месца выкліку, бо знаходзіліся да яго бліжэй за іншых. Выратавальнікі дасталі трох рыбакоў з вады і перадалі іх медыкам. Адзін з пацярпелых быў без прытомнасці. Работнікі АСВОДа праводзілі рэанімацыйныя мерапрыемствы, пасля чаго яго даставілі ў медустанову. Аднак там пазней былі вымушаны канстатаваць смерць... Два іншыя выратаваныя знаходзіліся ў свядомасці. Іх папярэднім дыягназам было агульнае пераахаладжэнне. Абставіны здарэння высвятляюцца. Відавочна, што мела месца звычайная чалавечая бестурботнасць: як мяркуецца, будучы нападпітку, рыбакі перакулілі лодку...

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ГЭТЫЯ БОЕПРЫПАСЫ МАГЛІ Б ЗАБІЦЬ

**У Лепельскім раёне падчас правядзення аператыўна-прафілактычнага мерапрыемства «Арсенал» канфіскавалі гладкаствольную паляўнічую зброю, адзінаццаць адзінак боепрыпасаў, два снарады часоў вайны.**

Паводле слоў Мікалая Латышава, начальніка Лепельскага раённага аддзела ўнутраных спраў, добраахвотна былі здадзены газавы пісталет і 47 адзінак боепрыпасаў. Да адміністрацыйнай адказнасці прыцягнуты адзін чалавек. У міліцыі нагадваюць, што за незаконны абарот зброі, боепрыпасаў, выбуховых прылад і выбуховых рэчываў установлена крымінальная адказнасць з пазбаўленнем волі да дванаццаці гадоў. А грамадзяне, якія добраахвотна здалі вышэйпералічаныя прадметы, вызваляюцца ад пакарання.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ГІБЛАЕ МЕСЦА?

**Паблізу вёскі Копці Віцебскага раёна ў аўтамабільную аварыю трапілі грамадзяне Узбекістана. «Нісан», у якім яны знаходзіліся, з'ехаў у кювет і перакуліўся. Пасажыр аўто 1971 года нараджэння загінуў, а другі пасажыр, 1984 года нараджэння, трапіў у бальніцу.**

Многія аўтамабілісты, якія праязджаюць Віцебскі раён, ведаюць, што пля вышэй названага населенага пункта знаходзяцца гарадскія могілкі. І стараюцца як мага больш акуратна весці аўто ў гэтым месцы. Эксперты па анамальных з'явах у свой час нават спецыяльна вывучылі наваколле («Звязда» пра гэта паведамляла) і прыйшлі да сумных высноў: месца негатыўнае. Але, вядома, калі не звяртаць увагі на ўсякія невясёлыя каментарыі і не парушаць правілы, то можна ўпэўнена ездзіць паўсюды.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■


**ОАО «Брестский комбинат строительных материалов» приобретает на баланс общества простые (обыкновенные) акции, выпущенные ОАО «Брестский комбинат строительных материалов**

| | |
|---|---|
| Полное наименование и место нахождения покупателя | Открытое акционерное общество «Брестский комбинат строительных материалов» 224028, г. Брест, ул. Гоздецкого, д. 28 |
| Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются | Открытое акционерное общество «Брестский комбинат строительных материалов» 224028, г. Брест, ул. Гоздецкого, д. 28 |
| Цель приобретения акций | Продажа инвестору |
| Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель | 1000 (Одна тысяча) штук |
| Цена, по которой покупатель намерен приобретать акции | 600 000 (Шестьсот тысяч) белорусских рублей за одну акцию с оплатой денежными средствами |
| Срок, форма и порядок оплаты акций | Путем перечисления денежных средств на счет продавца не позднее 30 банковских дней с момента заключения сделок купли-продажи акций пропорционально поданным заявлениям |
| Адрес, по которому будут заключаться договора купли-продажи акций | 224028, г. Брест, ул. Гоздецкого, д. 28 |
| Дата начала и окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций | с 10.12.2012 г. по 21.12.2012 г. |
| Дата начала и окончания покупки акций | с 24.12.2012 г. по 24.02.2013 г. |
| Контактный телефон | 8 (0162) 47 92 29 |

УНП 200295903

Информацию, опубликованную в газете «Звязда» № 228 от 27.11.2012 об утере страхового полиса ФСООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0309020, считать недействительной.

*УНП 100706519*


# ВАЛАНЦЁР ІДЗЕ НА ДАПАМОГУ

**Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа штогод праводзіць рэспубліканскую кампанію «Клопат». Яе мэта — аказанне дапамогі адзінокім пажылым людзям і інвалідам, а таксама старым, якія пражываюць адны. У гэтым арганізацыі дапамагае даволі вялікая армія валанцёраў. Толькі сёлета іх пабольшала на чвэрць. У той жа час у краінах Заходняй Еўропы дзейнасць добраахвотных памочнікаў рэгламентавана законам, які таксама вызначае іх статус. Але ў Беларусі такога закона дагэтуль не існуе, хоць гаворка пра яго ідзе з пачатку 2000-х гадоў.**

**Генеральны сакратар Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Віктар КАЛБАНАЎ** гаворыць, што валанцёрства ў краіне носіць пераважна маладзевы характар:

— Сёлета ў Беларусі сіламі нашай арганізацыі ажыццяўляецца 26 міжнародных праектаў і тры тысячы ўнутрырэспубліканскіх мерапрыемстваў. Яны скіраваны на аказанне дапамогі ўсім слаям грамадства — ад адзінокіх старых да маламаёмасных сем'яў. Паралельна са штатнымі супрацоўнікамі працуе па ўсёй краіне і 21 тысяча валанцёраў. Трэба адзначыць, што чатыры з кожных пяці валанцёраў — гэта вучні старэйшых класаў школ, навучэнцы медыцынскіх каледжаў і студэнты ўніверсітэтаў. І гэта прыносіць свой плён. Напрыклад, са студзеня па лістапад мы змаглі прыйсці на дапамогу больш чым 400 тысячам чалавек. Шкада, што дагэтуль дзейнасць валанцёраў не рэгламентавана заканадаўствам, як тое ўжо зроблена ва Украіне, Аўстрыі. Падымалася гэтае пытанне і ў Расіі. У Беларусі праект такога закона абмяркоўваўся на ўзроўні Нацыянальнага сходу, але ініцыятыва чамусьці не атрымала развіцця.

**Сёння ў Беларусі працуюць усяго 132 сястры міласэрнасці. А ў пазамінулым дзесяцігоддзі іх колькасць дасягала амаль тысячы.**

Хацелася б бачыць у радах валанцёраў болей людзей старэйшага пакалення. Зразумела, што ў іх назапашаны жыццёвы і прафесійны вопыт. Ды і вольнага часу ў іх таксама болей, чым у маладых, і таму на іх можна разлічваць рэгулярна. Для параўнання: у Даніі большая частка добраахвотных памочнікаў — людзі сярэдняга і пенсійнага ўзросту. Усяго ж у свеце колькасць валанцёраў Чырвонага Крыжа дасягае 100 мільёнаў.

**Таццяна СВЯТЛОВІЧ, менеджар праекта «Умацаванне службы сясцёр міласэрнасці» Беларускага Чырвонага Крыжа,** наракае, што з-за недахопу сродкаў рэзка паменшылася колькасць прафесіяналаў у гэтай сферы:

— Сёння ў Беларусі працуюць усяго 132 сястры міласэрнасці. А ў пазамінулым дзесяцігоддзі іх колькасць дасягала амаль тысячы. Такое рэзкае скарачэнне звязана з тым, што мы зараз не атрымліваем падтрымкі з дзяржаўнага бюджэту, а трымаемся выключна на ахвяраваннях і членскіх унёсках. Сёстры міласэрнасці аказваюць не толькі медыцынскую дапамогу. Яны дапамагаюць і па гаспадарцы, і ў паўсядзённым побыце, аказваюць індывідуальны догляд. Добра, што разам з сёстрамі міласэрнасці працуе і тысяча валанцёраў. Вельмі важна, што сярод іх ёсць і былыя медыцынскія работнікі, якія не даводзіцца спецыяльна вучыць.

Але валанцёры Беларускага Чырвонага Крыжа прыходзяць на дапамогу не толькі старым і адзінокім людзям. Тут паказальны прыклад дзейнасці Лідскай раённай арганізацыі. Ініцыятыўная група, што ўключае ў свой састаў пажылых людзей, стала дапамагаць сем'ям, дзе выхоўваюцца дзеці-інваліды. Яны прыходзяць да іх дадому, гуляюць з імі, вучаць розным рамёствам... А ў гэтых час бацькі маюць магчымасць заняцца ўласнымі справамі. Гэты праект нават атрымаў своеасаблівую назву — «Бабуля на гадзіну».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# СКЛАДНІКІ БЕРАЖЛІВАСЦІ

## «Зялёная» энергетыка

Інавацыйныя тэхналогіі заўсёды даюць плён. Самым буйным праектам у Магілёўскай вобласці ў альтэрнатыўнай энергетыцы сёлета стала біягазавая ўстаноўка, якая ў лістападзе пачала працаваць у адной з самых вядомых сельскіх гаспадарак рэгіёна — «Рассвет» імя К. Арлоўскага ў Кіраўскім раёне. Устаноўка ўзведзена каля калгаснага цяплічнага камбіната, адкуль будзе паступаць частка сыравіны. Ва ўстаноўцы таксама выкарыстоўваюцца кукурузны сілас і гной. Атрыманы біягаз пераўтвараецца ў цеплавую і электрычную энергіі.

— Гэта так званая «зялёная энергетыка», таму што яна працуе на аднаўляльных крыніцах, — тлумачыць начальнік аддзела энергетыкі, паліва і энергазберажэння Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Юркоў. — Сыравінны рэсурс (адходы з палёў, фермаў і цяпліц) ёсць заўсёды. Да таго ж на тыя ж палі вяртаецца экалагічна чыстае ўгнаенне, якое ў выніку атрымліваецца на біягазавай устаноўцы.

Праект каштаваў 13,5 млн еўра. Ён акупіцца за 7 гадоў, а потым будзе даваць чыстую эканомію. У год гэта складзе, паводле папярэдніх падлікаў, 100 млрд рублёў.

У Магілёўскай вобласці аб'яўлена і пра іншыя цікавыя праекты: у Чэрыкаўскім раёне нямецкія інвестары маюць намер узвесці парк сонечных батарэй, а ў Горацкім і Мсціслаўскім раёнах пачынаюцца цяпер комплексныя даследаванні хуткасці ветру, пасля чаго будзе прымацца рашэнне аб пабудове ветрапаркаў.

## Эфектыўна і эканомна

Мікалай Юркоў расказаў пра іншыя праекты ў энергетычнай сферы, якія дадуць у будучым эканомію сродкаў. У Слаўгарадзе ў наступным годзе будзе зроблена кагенерацыйная ўстаноўка для камбінаванай вытворчасці цяпла і энергіі. Гэта дазволіць забяспечыць жыхароў райцэнтра гарачай вадой. Устаноўка запрацуе ў чэрвені 2013 года. Фінансуецца гэты праект за кошт крэдыту Сусветнага банка.

На прадпрыемстве «Белшына» ў Бабруйску пачнецца будаўніцтва міні-ЦЭЦ, якая будзе выпрацоўваць цеплавую і электрычную энергіі.

## Новыя падыходы

Мадэрнізацыя вытворчасці каштуе дорага, але без яе не абысціся.

Станоўчы прыклад — адкрытае акцыянернае таварыства «Шклоўскі масларобчы завод». У 2009 годзе там адбылася буйная мадэрнізацыя вытворчасці. У выніку сыравіна перапрацоўваецца хутчэй, на гэта выдаткоўваецца менш вады і энергіі. Усё ўзаемазвязана: чым больш сыравіны і хутчэй яна перапрацоўваецца, тым меншыя выдаткі на прадукцыю.

На Крычаўскім хлебазаводзе мяркуюць, што павялічыць агульную рэнтабельнасць прадукцыі дазволіць новы цэх па вытворчасці кардоннай тары. Новую лінію ўсталявалі на старым складзе, абсталяванне і рамонт памяшкання каштавалі больш за мільярд рублёў, але ўсё акупіцца праз некалькі гадоў. Завод эканоміць на сваёй тары, а таксама будзе мець прыбытак ад продажу кардоннай тары іншым прадпрыемствам.

Прыклады эканоміі можна знайсці і ў іншых сферах народнай гаспадаркі. Напрыклад, у Магілёўскай вобласці новыя фермы будуюцца з выкарыстаннем драўляных канструкцый. Такія збудаванні дэманстравалі сёлетняй восенню гасцям «Дажынак» у сельскагаспадарчым вытворчым комплексе «Аўсянка» Горацкага раёна. Менавіта тут вырашылі зэканоміць і выкарыстаць звыклы для сялян мясцовы матэрыял. Цяпер спецыялісты расказваюць, што дрэва стварае асаблівы мікраклімат, які ўплывае станоўчым чынам на прадукцыйнасць жывёлы.

## Вучыцца ніколі не позна

Беражлівасць датычыцца і кожнага з нас. Калі казаць пра энергетыку, то цяпер выйграюць тыя свядомыя грамадзяне, якія пачалі ажыццяўляць уласную праграму энергазберажэння, мянялі лямпачкі ў кватэрах і дамах на энергазберагальныя. Выдаткавалі грошы раней — выгаду атрымліваюць цяпер. У такіх людзей паведамленні аб уводзінах сістэмы дыферэнцаванай аплаты электрычнай энергіі не выклікаюць вялікіх трывог.

Аднак пачаць ніколі не позна. У закрытым акцыянерным таварыстве «Тэхнапарк Магілёў» адзін з галоўных кірункаў працы — эканомія энергіі. Генеральны дырэктар Васіль Малачкоў зацікавіўся нямецкім вопытам у гэтай справе, і вынікам стала стварэнне інфармацыйна-кансультацыйнага цэнтра па энергазберажэнні.

Усе паслугі цэнтра — бясплатныя. Яго стваральнікі лічаць, што энергазберажэнне — важнейшы элемент жыцця сучаснага чалавека. Гэта не залежыць ад узроўню даходаў, а ад свядомасці. Таму што эканоміць энергію — гэта значыць зберагчы не толькі свае грошы, але і экалогію.

Неабавязкова наведваць абласны цэнтр, каб навучыцца эканоміць энергію. Дастаткова зайсці на сайт тэхнапарку: у спецыяльным раздзеле можна знайсці энергакалькулятары, якія дапамогуць разлічыць энергаэфектыўнасць лямпаў новага пакалення і вокнаў, знізіць страты ў спажыванні вады і даведацца пра перавагі найноўшай сістэмы разумнага асвятлення ў кватэрах з дапамогай датчыкаў. Усім варта лічыць грошы, эканоміць.

**Ілона ІВАНОВА.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

■ Як нас дураць

## ВІЛЬГОТНЫЯ СУРВЭТКІ ЗА... ПЯЦЬ МІЛЬЁНАЎ

**У Савецкае РУУС г. Мінска звярнулася 65-гадовая жыхарка сталіцы, якая стала ахвярай махляроў.**

Яна распавяла, што да яе на вуліцы падышлі незнаёмцы і падзяліліся жахлівай гісторыяй: маўляў, іх кіроўца патрапіў у аварыю, тэрмінова патрэбны грошы на лекі, а беларускіх грошай няма — толькі замежная валюта. Чуллівая бабуля прапанавала абмяняць валюту ў абменным пункце, аднак яе візаві спасаліся на недахоп часу. І тады пенсіянерка пагадзілася дапамагчы незнаёмцам, зняўшы з рахунку ў банку 5 мільёнаў рублёў. У залог тыя пакінулі жанчыне чамаданчык, сказаўшы, што ў ім быццам бы знаходзіцца каштоўная рэч... Праз пару гадзін, так і не дачакаўшыся ні саміх людзей, ні звароту імі доўгу, пенсіянерка адчыніла чамадан. І ўбачыла ў ім упакоўку... вільготных сурвэтак.

Праз некалькі дзён на пагранічным пераходзе ў Брэсце была затрымана сямейная пара са Славакіі, якая падазраецца ў здзяйсненні аналагічных злачынстваў на тэрыторыі абласнога цэнтра. Зараз высвятляецца прыналежнасць затрыманых да аферы ў сталіцы.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# КАМУ НА ПЕНСІІ ЖЫВЕЦЦА ВЕСЕЛА?

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— З нашымі пенсіянерамі ўсё нармальна, проста пра запатрабаванні і інтарэсы пажылых людзей з актыўнай жыццёвай пазіцыяй мы амаль не ведаем. У гэтым і ваша, журналісцкая віна ёсць, — адказвае на маё пытанне Святлана Бабій, кіраўнік Баранавіцкага клуба дзелавых жанчын «Прэстыж». — Вобраз пенсіянера, сфармаваны СМІ, і стаўленне да старых як да часткі насельніцтва, якой «ужо нічога не трэба», не дазваляе нам у поўнай меры скарыстацца гэтым багаццем нацыі. Але пенсіянеры — гэта людзі, якія маюць, як правіла, грандыёзны працоўны вопыт, мудрасць і разважлівасць. І, што немалаважна, жаданне прыносіць грамадству карысць. Яны могуць займацца грамадскай працай і валанцёрствам, асвойваць творчыя прафесіі і дзяліцца набыткам з маладымі. Проста ім трэба зусім крыху дапамагчы...

Пра тое, чаго хочуць пажылыя мужчыны і жанчыны, Святлана кажа з веданнем справы — летась клуб задумаў праект па навучанні пенсіянераў камп'ютарным азам. Асвойвалі спачатку «разумную» машыну 40 жыхароў горада Баранавічы і Баранавіцкага раёна. Курсы (а чыталі іх слухачам 36 гадзін) спадабаліся. Вынікам праекта стаў дзіўны конкурс «На лепшага камп'ютарнага і інтэрнэт-карыстальніка ад 60 гадоў і старэй...». Паўдзельнічаць у ім, дарэчы, выказалі жаданне не толькі тыя, хто скончыў курсы, але і пенсіянеры, якія прачыталі аб'яву аб будучых спаборніцтвах у мясцовых газетах і на тэлебачанні. У заданнях, напрыклад, патрабавалася набраць тэкст рознымі шрыфтамі Word, скласці табліцу і падлічыць тыднёвы бюджэт сям'і ў Excel, знайсці ў інтэрнэце і «спампаваць» зададзеную песню, адправіць сябрам на e-mail віншавальную паштоўку і нават віртуальна запісацца на прыём да ўрача ў гарадскую паліклініку. На выкананне 8 заданняў давалася ўсяго 2 гадзіны. Бабулі і дзядулі (хоць язык, шчыра кажучы, не паварочваецца называць іх так!) справіліся на «выдатна», за што і атрымалі каштоўныя прызы. А самае галоўнае — бясцэнны вопыт і новых сяброў.

Адной з пераможцаў конкурсу Зінаідзе Дзмітрыеўне Вяршынінай — 64 гады. У мінулым спаборніцтве заняла трэцяе месца.

— Пайшла на пенсію і купіла сабе камп'ютар, — дзеліцца яна са мной. — Тое-сёе сама вывучыла, іншае спасцігала на віртуальных курсах. Але, на жаль, яны разлічаны на больш маладых і «прасунутых» карыстальнікаў. Таму, калі пачула, што ў нас у горадзе адкрываюцца такія вось курсы, запісалася адной з першых. Даступна, зразумела, ды і з жывым выкладчыкам нашмат прыемней мець зносіны! Цяпер вось з задавальненнем удзельнічаю ў разнастайных інтэрнэт-трэнінгах, канферэнцыях па здаровым ладзе жыцця. Маю задумку адкрыць свой бізнэс у сетцы...



Ніна Уладзіміраўна Сідарэнка вывучыла б не толькі камп'ютар.

61-гадовая Ніна Уладзіміраўна Сідарэнка пра курсы даведалася занадта позна — вучні былі ўжо набраныя. Але ў конкурсе паўдзельнічала і стала другой. Зрэшты, на конкурс яна прыйшла не столькі дзеля прызоў, колькі дзеля новых сяброў.

— На пенсіі сумна, — прызнаецца. — Я ўсё сабе занякті прыдумляю, а тут, у клубе, столькі цікавых людзей! Я б і на іншыя курсы запісалася — фатаграфаваць хацелася б навучыцца...

Добра, што навучанне пажылых людзей «камп'ютару» стала цяпер справай амаль звычайнай. Дрэнна, што ўцягванне гэтай катэгорыі грамадзян у актыўнае жыццё абмежавана вузкімі «камп'ютарнымі» рамкамі. А дзесьці няма і гэтага. У большасці сваёй пенсіянеры па-ранейшаму спяваюць народныя песні і гуляюць у шашкі. Не, я не маю нічога супраць песень, танцаў і настольных гульняў. Справа не ў гэтым, а ў тым, што пажылыя людзі ў нашай краіне часта пазбаўлены доступу да самага элементарнага.

Хтосьці з цяжкасцю карыстаецца мабільным тэлефонам, таму што вытворца ў пагоні за маладым спажыўцом не падумаў пра зручныя кнопкі — для пажылых. Хтосьці не здымае карункавую сурвэтку з пральнай або пасудамыйнай машыны, падоранай да юбілею дзецьмі і ўнукамі. Паспрабуй засвоіць разумную тэхніку, калі нават не разумееш, пра што гаворыцца ў інструкцыі!.. Хтосьці ўвогуле баіцца заходзіць у сучасныя крамы, боназаўжды выбіты са спакойнага стану словамі прадаўца-кансультанта аб «дэвайсах» і «гаджэтах».

— Я была здзіўлена, што змагла запісацца на прыём да ўрача па інтэрнэце, — дзялілася са мной Зінаіда Дзмітрыеўна Вяршыніна. — Так зручна, не трэба ў чарзе стаяць, можаш выбраць зручны для сябе час! Цяпер вось думаю, што трэба было б і камунальныя паслугі аплачваць праз інтэрнэт — зноў жа ніякіх табе чэргаў!




Зінаіда Дзмітрыеўна Вяршыніна цяпер нават бізнэс у інтэрнэце падумвае распачаць.

Інтэрнэт-запіс да ўрача, заказ чыгуначных білетаў, інтэрнэт-банкінг, інтэрнэт-крама... Паслугі ўжо не новыя, звыклыя, але ці многім пажылым людзям яны даступныя? Ці многія з 2,5 мільёна пенсіянераў, якія насяляюць нашу краіну, умеюць карыстацца гэтымі зручнымі прапановамі? Упэўнена, што не. І не таму, што не хочуць — не могуць...

Але вернемся да баранавіцкага клуба дзелавых жанчын. З наступнага года ў ім зноў пачнуць дзейнічаць камп'ютарныя курсы для пажылых. Цалкам сур'ёзна абмяркоўваецца магчымасць адкрыцця курсаў па асновах фотасправы для пенсіянераў, магчыма, з'явяцца курсы, якія дапамогуць правільна распараджацца не такім ужо і вялікім «пенсійным» бюджэтам. А пенсіянеры, актыўныя і дзейныя, радуюцца гэтаму, як дзеці! Бо не збіраюцца старэць. Можа, сапраўды на пенсіі жыццё толькі пачынаецца?

**Таццяна ГРЫНКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

## Май на ўвазе

### АБМЕЖАВАНА РЭАЛІЗАЦЫЯ NESTLE NESQUIK

**Аб гэтым паведамілі БЕЛТА ў Міністэрстве гандлю.**

Гэты захад у міністэрстве растлумачылі тым, што на сайце ўпраўлення ЗША па наглядзе за якасцю харчовых прадуктаў і лекавых сродкаў размешчана інфармацыя аб добраахвотным адкліканні з абарачэння шакаладнага парашку Nestle NESQUIK у сувязі з магчымай наяўнасцю ў ім узбуджальнікаў вострых кішэчных інфекцый — сальманел.

Як сцвярджае ТАА «Нестле Расія», адкліканне шакаладнага хуткараставаральнага напітку распаўсюджваецца толькі на рынак ЗША, таму што гэты прадукт вырабляецца ў ЗША і на рынкі Еўропы і краін СНД не пастаўляецца.

Тым не менш Міністэрствам аховы здароўя Беларусі прапанавана прыняць захады па недапушчэнні абароту і канфіскацыі ў выпадку выяўлення на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь шакаладнага парашку Nestle NESQUIK, выраблена ў пачатку кастрычніка 2012 года і расфасаванага ў каністры па 10,9; 21,8 і 40,7 унцыі (унцыя — прыкладна 30 мл). Тэрмін прыдатнасці — кастрычнік 2014 года.

Таксама ў міністэрстве паведамілі, што органам па сертыфікацыі прадукцыі, паслуг і персаналу БелДІМ адмоўлена ў выдачы сертыфікату адпаведнасці імпарцёру ТАА «МаксХарчгандаль» на партыю прадукцыі вытворчасці ТАА «Гандлёвы дом «Лера», Расія, Смаленская вобласць, г.Вязьма (сокі і нектары гандлёвай маркі Kral Premium). Прычынай адмовы стала неадпаведнасць гэтай прадукцыі патрабаванням СТБ па масавай долі оксіметылфурфуролу, наяўнасці кансерванту (сарбінавай і бензойнай кіслаты) і сінтэтычнага фарбавальніку.

## Старыя рэчы

# ДЫЯФІЛЬМ: назад у дзяцінства

**Што такое дыяфільм, сёння ведае не кожны. І гэта зусім не дзіва. У цяперашні час развіцця інфармацыйных тэхналогій падрастаючае пакаленне знаёміцца са светам, у якім жыве, пры дапамозе тэлевізара і інтэрнэту. Глабальнае «павуцінне» перапоўнена відэаролікамі, фільмамі, малюнкамі пра якія заўгодна з'явы нашага жыцця. Раней такога доступу да інфармацыі не было, таму кожны, хто старэй за дваццаць гадоў, памятае гудзенне дыяпраектара фільмаскопа і яркі прамень, што ператвараў белую прасціну ў чароўны экран, на якім змяняліся каляровыя малюнкі.**

### Гісторыя ўзнікнення

Дыястужка — гэта паслядоўнасць малюнкаў, надрукаваных на пазітыўнай плёнцы. Для многіх з нас — цёплы ўспамін бесклапотнага шчаслівага дзяцінства. Кадры гэтай стужкі звязаныя між сабой па сэнсе, часцей за ўсё суправаджаюцца тэкстам, і які ператварае кадры ў паслядоўны аповед. У савецкія часы значная колькасць каляровых дыяфільмаў выпускалася для дзяцей дашкольнага, малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. Гэта былі стужкі на сюжэты народных казак, твораў мастацкай літаратуры, фільмаў. Акрамя мастацкіх, выпускаліся яшчэ і навучальныя дыяфільмы, якія выкарыстоўваліся ў якасці нагля́дных дапаможнікаў для школ, ВНУ. Невялікая колькасць дыяфільмаў рабілася з гукавым суправаджэннем на магнітнай стужцы або, часцей, на вінілавых пласцінках. Акрамя Савецкага Саюза, дыястужкі яшчэ былі ў ЗША.

**З распаўсюджаннем відэазапісаў дыястужкі фактычна выйшлі з карыстання. Але і сёння ў Кітаі вырабляюць дыяпраектары «Светлячок» і «Рэджыа», працягваецца і выпуск «Пеленг-500».**

Прыбор, пры дапамозе якога дыястужку можна было «ажывіць», называўся фільмаскопам. Дзякуючы яго параўнальна нізкаму кошту (танныя каштавалі 5 рублёў 70 капеек, сярэдняга класу — каля 30 рублёў) прагляд дыястужак быў вельмі распаўсюджаны ў сем'ях, дзе былі малыя дзеці.

Асноўным вытворцам дыястужак у Савецкім Саюзе была студыя «Дыяфільм». Менавіта яна падарыла савецкім дзецям сотні плёнак з іх любімымі персанажамі: Малы Янот, Трус і Воўк, Кот Матроскін, Папялушка, Дзядзя Сцёпа. Дыяфільмы прадаваліся ў крамах у дзіцячых аддзелах, таксама іх можна было заказаць па каталогу «Пасылгандлю» на пошце. Шмат сем'яў атрымлівалі цэлыя пасылкі з дыястужкамі, а потым кожны вечар ператваралі дзіцячы пакой свайго дома ў чароўны кіназал.

### «Крыўдным было чакаць, пакуль сцямнее»

«Як гэтая рэч трапіла ў наш дом, я не ведаю, бо была зусім маленькай, можа, гады тры мне было, калі я ўпершыню ўбачыла дыяфільмы, — дзеліцца ўспамінамі 24-гадовая дзяўчына Інга Купчына. — Думаю, мае бацькі набылі гэты прыбор нам з сястрой у краме. Як толькі ў дзіцячым аддзеле з'явіліся новыя мультфільмы, маці адразу прыносіла нам новыя цудоўныя бляшаначкі з дыястужкамі. Увечары тата з мамай вешалі на сцяну замест дывана вялікую белую прасціну — мне вельмі не падабалася, што яны не прасавалі яе *(смяецца)* — і пачыналіся кінасеанс. Спачатку бацькі глядзелі дыяфільмы разам з намі, а потым мы рабілі самастойныя прагляды, нават запрашалі сяброў. Мы з сястрой часта спрачаліся, хто будзе ў ролі кінамеханіка і адначасова дыктара. Самым крыўдным было тое, што глядзець дыяфільмы можна было толькі тады, калі на вуліцы цямнела. Адноййчы маці прынесла дыястужку «Трое з Прастаквашына», і я ніяк не магла дачакацца, калі ж надыдзе ноч. У пачатку дзевяностых бацька прывёз з Польшчы відэамагнітафон, і мульцікі мы пачалі глядзець па відэаплэйцы. Так прагляд дыястужак сам па сабе адышоў на другі план».



**Фільмаскопы з дыястужкамі перамясціліся на антрэсолі. Гэта быў свет павучальных апавяданняў, прыгод і чароўных казак. Сёння гэтыя гісторыі ў малюнках пакрываюцца пылам у шафах, вельмі рэдка нагадваючы нам пра тое, як мы, цяпер дарослыя, жылі ў цудоўным свеце, вольным ад нашых цяперашніх праблем і клопатаў.**

**Любоў БЯЛЯЕВА.**
**Фота аўтара.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
6 СНЕЖНЯ 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 23 (15709)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

*Будзем знаёмыя!*

Беларускі ўдзельнік дзіцячага «Еўрабачання-2012» Ягор ЖЭШКА:

# «РАДАВАЦЦА ЖЫЦЦЮ І ЗАСТАВАЦЦА САМІМ САБОЙ»

За спінай у Ягора заўжды надзейны тыл — тата Іван Анатольевіч і мама Ірына Эдуардаўна.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**...Яны вярнуліся ў Мінск вельмі стомленыя і прастуджаныя — назаўтра амаль усе не пайшлі ў школу. І ўсё адно шчаслівыя і радасныя. Здаецца, што, у адрозненне ад большасці дарослых крытыкаў і назіральнікаў, маленькія ўдзельнікі «Дзіцячага Еўрабачання» адчулі і праніклся галоўным прынцыпам конкурсу: гэта не спаборніцтва «хутчэй-вышэй-мацней», а перш за ўсё — агульнае свята і магчымасць набыць новых сяброў з розных краін свету.**

**Прынамсі, тэлекарцінка з конкурсу была менавіта такой — святочнай і лёгкай. Пра тое ж, чым жыло і як выглядала дзіцячае «Еўрабачанне» знутры, нам распавялі беларускі канкурсант Ягор Жэшка і яго мама — Ірына Эдуардаўна.**

## ПОГЛЯД НА АМСТЭРДАМ З 18-ГА ПАВЕРХА

— Горада, шчыра кажучы, я практычна не бачыў: не было часу, — збянтэжана прызнаецца Ягор. — Нават падчас агульнай экскурсіі на цеплаходзе мы былі без экскурсавода, плылі па самай сярэдзіне вельмі шырокіх каналаў і разгледзець маглі хіба што далёкія агні і буйныя будынкі банкаў ды рэстаранаў.

— І з акна аўтобуса шмат не разгледзіш, — пагаджаецца Ірына Эдуардаўна. — Ды надвор'е было не для прагулак: дождж, потым раптам выглядвае сонца, потым зноў дождж, сыра і досыць ветрана — горад жа на вадзе! А ў атэлі, дзе размясцілі ўсіх удзельнікаў, мы жылі на 18-м паверсе, прычым ліфты то не працавалі, то іх трэба было вельмі доўга чакаць, так што сіл і часу на разглядванне панарамы горада таксама заставалася няшмат. Хоць тое, што мы паспелі ўбачыць, безумоўна, уразіла. Амстэрдам вельмі прыгожы горад: мноства мастоў цераз каналы, якія бягуць ва ўсе бакі, падземнае і надземнае метро, двухпавярховыя электрычкі...

Што ўразіла беларусаў, дык гэта нязвыклая ежа. У Нідэрландах зусім няма супоў у нашым разуменні: тое, што еўрапейцы называюць супам, для нас, хутчэй, пюрэ. «Аднойчы мы не вытрымалі, заказалі курыны булён — во, думаем, зараз нарэшце паядзім. А прынеслі... суп з цыбулі. І бульба там даволі дзіўная: уявіце, што з пюрэ зляпілі каўбаскі, абсыпалі іх паніроўкай, як у «Макдональдсе», і абсмажылі. Карацей, я засумаваў па нашай ежы».

— Нейкіх далікатэсаў у меню я не прыпомню. А для дзяцей бульба-фры, добра абсмажаная, на свежым алеі, хрусткая, гарачая, — вось што было найлепшым ласункам, — смяецца Ірына Жэшка. — А калі дадому ляцелі, вырашылі: у Мінску першым чынам закажам піцу.

— З улікам таго, што тата без нас нагаварыў журналістам, — дзесяць піц! На год наперад.

## СЛАБЫХ НЕ БЫЛО

«Вокладка» дзіцячага конкурсу, па традыцыі, яркая і вясёлая. Закулісная ж частка, адзначаюць беларускія ўдзельнікі, вельмі сціплая. Грымёркі — невялічкія пакоі з пластыкавымі перагародкамі, без люстэркаў, толькі пара крэслаў («Нам не хапала», — адзначае Ягор) і столік. Суседнімі з беларусамі былі грымёркі Украіны, Грузіі І Азербайджана, і дзецям удавалася не толькі пагутарыць адно з адным, а нават пагуляць у перапынках паміж рэпетыцыямі.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

*Класныя навіны*

# МНЕ 12 ГАДОЎ, І Я НЕ КУРУ... ПАВОДЛЕ КАНТРАКТА

**Хочаце, каб падлетак уяўляў сабой эталон паслухмянасці? Заключыце з ім дамову!**

**ІНФАРМАЦЫЯ пра тое, што ў некаторых мінскіх школах пад абавязацельствамі не ўжываць алкаголь і не курыць падпісваюцца шасцікласнікі, напачатку выклікала ў рэдакцыі цэлы выбух жартаў: «Запытайся, ці выгадныя ўмовы і ці збіраецца нехта працягваць кантракт надалей?». Нешта падобнае, шчыра сказаць, круцілася і ў маёй галаве.**



Шасцікласнік Дзмітрый Грыгор'еў са сваім кантрактам.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ага, паставіў, значыць, подпіс, а пасля, калі раптам парушыш хоць адзін з пунктаў кантракта — будзеш пакутаваць ад дакораў сумлення? А калі спакуса даведацца, што ж такога смачнага, напрыклад, у чырвоным віне, акажацца больш моцнай, чым абавязацельствы, пад якімі падпісаўся, і шасцікласнік такі не ўтрымаецца і ціхенечка паспытае віно на язык? Якія спагнанні прадугледжаны кантрактам?

...У школе нас сустракаюць яшчэ на ўваходзе і праводзяць да кабінета псіхолага.

— Чаму шасцікласнікі? Якраз у такім узросце, у дванаццаць гадоў, у падлетка ўзнікае жаданне адчуць сябе дарослым. І перш за ўсё — паспытаць забароненае. Цыгарэты, алкаголь — пра наркотыкі нават казаць страшна. Каб нашы вучні зразумелі, як гэта дрэнна, мы вырашылі прывіць ім гэтае разуменне цяпер, каб не было позна, — тлумачыць **педагог-псіхолаг сярэдняй школы № 116 г. Мінска Вольга ЖМАЧЫНСКАЯ** і дастае стос папер, запоўненых дзіцячым почыркам.

Вось яны, «сакральныя» дамовы з бацькамі, свядомасцю і сваім сумленнем! Школьнікі, як сур'ёзныя дзелавыя людзі, паставілі свае подпісы пад абяцаннямі «не курыць, не ўжываць алкаголь, наркатычныя і таксічныя рэчывы, не здзяйсняць правапарушэнняў». Акрамя таго, у кантракце ёсць такія пункты: не праяўляць агрэсіўныя паводзіны, не падвяргаць іншых прыніжэнню, фізічнаму і псіхічнаму гвалту і добрасумленна выконваць абавязкі вучня.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

*Прыгожы крок да дыялогу*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

# ЗРАЗУМЕЕШ КУЛЬТУРУ — ЗНОЙДЗЕШ СЯБРА

**ФЕСТЫВАЛЬ нацыянальных культур у Гродне ўжо стаў традыцыйным святам, на якое з'язджаюцца прадстаўнікі розных народаў з усіх куткоў Беларусі. Папулярнасць набывае і Фестываль нацыянальных культур сярод студэнтаў універсітэтаў. У Ліцэі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта прайшло ўжо чацвёртае студэнцкае мерапрыемства гэтай накіраванасці.**

## Студэнцтва International

У фестывалі прынялі ўдзел студэнты васьмі ВНУ. Дарэчы, у гэтым годзе ў ім упершыню выступілі студэнты з Гродна.

Усе ўдзельнікі прайшлі адбор унутры свайго ўніверсітэта, таму на сцэне прадэманстравалі свае здольнасці самыя цікавыя выступоўцы як з Беларусі, так і з Азербайджана, Кітая, Туркменістана, Турцыі, Малайзіі, Нігерыі, Ірана, В'етнама, Намібіі, Ганы, Гвінеі і Сірыі.

Сярод гледачоў былі прадстаўнікі пасольства Турцыі і Ірана. Падтрымаць сваіх сяброў і аднакурснікаў прыйшлі і самі студэнты — як беларускія, так і замежныя. Дарэчы, аўдыторыя вельмі цёпла прымала артыстаў.

## Танга з... Кітая

Не дзіўна, што актыўны ўдзел у канцэрце прынялі кітайскія студэнты. Іх шмат і ў мінскіх ВНУ, і ва ўніверсітэтах іншых гарадоў Беларусі. У прыватнасці, студэнт педагагічнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы «ўзарваў» залу клубным танцам і песняй. Хлопец прымусіў гледачоў адчуць сябе ў начным клубе, некаторыя дык наогул... падтанцоўвалі седзячы.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
06 12 2012 г.

*Працоўны семестр*

# І АДПАЧЫЛІ, І ЗАРАБІЛІ...

## Ці будуць студэнцкія атрады дзейнічаць круглы год?



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**У наступным годзе студатрадаўскі рух у Беларусі адзначыць сваё 50-годдзе. А літаральна днямі былі падведзены вынікі сёлетняга працоўнага семестра, які доўжыўся з 1 мая па 30 верасня. Усяго за летнія месяцы ў складзе 2040 студэнцкіх атрадаў былі працаўладкаваны 47 863 чалавекі. Для параўнання: летась гэта лічба склала 27,3 тысячы чалавек, а ў 2010 годзе — каля 20 тысяч.**

— Указ кіраўніка дзяржавы «Аб арганізацыі дзейнасці студэнцкіх атрадаў» ад 16 красавіка гэтага года значна спрасціў фарміраванне студэнцкіх атрадаў і ўзгадненне пераліку аб'ектаў, дзе студэнты могуць і рабіць, і зарабіць, там, дзе ёсць работа для студэнцкіх рук, — расказала **другі сакратар ЦК БРСМ Альбіна СЫЧЭЎСКАЯ.** — У студэнцкія атрады цяпер могуць уключацца маладыя людзі ва ўзросце ад 14 да 31 года — такім чынам, стаць байцом атрада могуць і непаўналетнія.

Гэта норма пацягнула за сабой павелічэнне колькасці школьнікаў, працаўладкаваных у летні час, да 45 тысяч. Непасрэдна ў студатрадах сёлета працавала амаль 20 тысяч падлеткаў.

А ўсяго ў трэцім працоўным семестры на розных аб'ектах шчыравалі 684 будаўнічыя атрады, 783 сельскагаспадарчыя, 182 педагагічныя, 141 экалагічны атрад і 250 сэрвісных атрадаў. Сярод самых знакавых аб'ектаў — Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Студэнцкая вёска ў Мінску, Лядовы палац у Оршы, Моладзевы цэнтр у Гродне, рэканструкцыя чыгуначнага вакзала ў Брэсце, падрыхтоўка Горак да рэспубліканскага фестывалю «Дажынкі».

Па словах Альбіны Сычэўскай, заробкі байцоў студэнцкіх атрадаў у гэтым годзе істотна ўзраслі. Сярэдняя заработная плата ўдзельнікаў студатрадаў склала 2 млн 800 тысяч рублёў за поўны месяц. Мінімальная аплата пры 8-гадзінным рабочым дні — 1 млн 150 тысяч рублёў. А максімальная дасягнула 11 млн рублёў — столькі змаглі зарабіць байцы выязнога атрада на будаўніцтве аўтадарогі ў Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе ў Расійскай Федэрацыі. І 7 млн 200 тысяч рублёў зарабіў камандзір будаўнічага атрада БНТУ Сяргей Роўба на будаўніцтве Фаніпальскай сярэдняй школы.

### «КУРОРТНЫЯ» ВЫПРАБАВАННІ

Безумоўна, маладыя людзі імкнуцца, як правіла, не толькі падзарабіць, але і атрымаць аднačасова новыя ўражанні ад новых гарадоў ці нават новых краін. БРСМ удалося сфарміраваць сёлета 28 выязных студэнцкіх атрадаў (натуральна, што першачарговае права трапіць у іх мелі актывісты гэтай арганізацыі), але ў грамадскім аб'яднанні моладзі канстатуюць, што забяспечыць годныя ўмовы для нашых студэнтаў за межамі Беларусі даволі праблематычна, і далёка не заўсёды прымаючы бок ідзе беларусам насустрач. Тым не менш адзін зводны сэрвісны атрад, які складаўся з дзвюх соцень беларускіх студэнтаў, працаваў на цягніку «Масква-Іжэўск», выконваючы функцыю праваднікоў. 6 сельскагаспадарчых атрадаў шчыравалі ў Маскоўскай вобласці, адзін будаўнічы атрад, сфарміраваны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце транспарту, прыцягваўся да будаўніцтва алімпійскіх аб'ектаў у Сочы. Працавалі беларускія студэнты ў Расіі таксама на будаўніцтве ўчастка чыгункі ў Забайкальскім краі, у Ленінградскай вобласці, у санаторыях і аздараўленчых комплексах Краснадарскага краю.

**«Сярэдняя заработная плата ўдзельнікаў студатрадаў склала 2 млн 800 тысяч рублёў за поўны месяц. А максімальная дасягнула 11 млн рублёў — столькі змаглі зарабіць байцы выязнога атрада на будаўніцтве аўтадарогі ў Ямала-Ненецкай аўтаномнай акрузе ў Расійскай Федэрацыі».**

— Асабліва хацелася б адзначыць нашых студэнтаў, якія працавалі ў курортным комплексе «Надзея» ў Геленджыку, — падкрэсліла Альбіна Сычэўская. — Маладыя людзі годна справіліся з цяжкай сітуацыяй, якая склалася ў Краснадарскім краі ў сувязі са стыхійным бедствам. Яны шчыра адгукнуліся на чужую бяду і добраахвотна кінуліся на дапамогу пацярпелым, чарговы раз даказаўшы, што беларуская моладзь захоўвае найлепшыя чалавечыя якасці і каштоўнасці.

### СТУДАТРАД — ГЭТА ПАДАТКОВЫЯ ЛЬГОТЫ?

— ...Цяпер ЦК БРСМ працуе над арганізацыяй круглагадовай працоўнай занятасці моладзі ў складзе студатрадаў. Аб слушнасці гэтага кроку сведчаць вынікі анкетавання, праведзенага БРСМ сумесна з Міністэрствам адукацыі сярод вучнёўскай і студэнцкай моладзі. Так, амаль 70% апытаных шукаюць магчымасць атрымліваць не толькі стыпендыю, але і зарплату за сваю работу. Адна з самых прыдатных формаў, на нашу думку, — гэта арганізацыя работы студэнцкіх атрадаў на працягу ўсяго года. У тым выпадку, калі наша ініцыятыва будзе падтрымана, у нас з'явіцца дадатковая магчымасць узмацніць гарантыі, што прадугледжаны працоўным заканадаўствам, — расказала Альбіна Сычэўская. — Да таго ж прымяненне пры арганізацыі круглагадовай другаснай занятасці моладзі такой формы, як студатрады, дазволіць вызваліць маладых людзей ад выплаты падаткаў, што прадугледжана Падатковым кодэксам для ўдзельнікаў студатрадаў.

Сёння ўсе наймальнікі ў адзін голас кажуць, што маглі б заплаціць студэнтам намнога больш, калі б тыя мелі хоць бы першасныя навыкі па рабочых спецыяльнасцях. Цяпер асноўнай праблемай пры арганізацыі прафесійнай падрыхтоўкі з'яўляюцца тэрміны навучання і адсутнасць крыніцы яе фінансавання. Мы сумесна з Міністэрствам адукацыі і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны ўжо другі год працуем над арганізацыяй дадатковага навучання ўдзельнікаў студэнцкіх атрадаў па спецыяльнасцях, неабходных ім для работы, але, на жаль, пытанне пакуль застаецца нявырашаным. Таму звяртаемся да Міністэрства адукацыі і рэктараў з просьбай не адкладваць гэтае пытанне яшчэ на цэлы год, а ўсё ж такі разгледзець альтэрнатыўныя варыянты арганізацыі кароткатэрміновага (да 1 месяца) дадатковага навучання па канкрэтных спецыяльнасцях.

Шмат праблем узнікае і з дэклараваннем даходаў, атрыманых удзельнікамі студэнцкіх атрадаў за мяжой. На падставе пагаднення аб недапушчэнні двайнога падаткаабкладання, падпісаных паміж Рэспублікай Беларусь і краінамі Адзінай эканамічнай прасторы, фізічныя асобы, якія выязджаюць для работы за мяжу, вызваляюцца ад выплаты падаходнага падатку ў Беларусі. Аднак для гэтага ім трэба прадаставіць дакументы (даведку аб сумах даходаў і ўтрыманых падатках), завераныя замежным падатковым органам. На практыцы зрабіць гэта аказваецца надзвычай праблематычна, таму беларускія студэнты пасля вяртання на радзіму вымушаны яшчэ раз плаціць падаходны падатак.

### ДАЕШ «ЛЁГКІЯ ВІДЫ»!

Яшчэ адна прапанова БРСМ — пашырыць пералік лёгкіх відаў работ, якія могуць выконвацца асобамі ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў, і дадаць у яго такія віды работ, як укладка тратуарнай пліткі, абклейванне шпалерамі, фарбаванне паверхняў, догляд за жывёлай і г.д. — усяго прапануецца пералік з 39 пунктаў.

— Сучасныя падлеткі дастаткова добра фізічна развітыя і, як сведчыць практыка, здольныя выконваць іншыя віды работ, якія, адпаведна, і аплачваюцца лепш, — абгрунтавала сваю пазіцыю другі сакратар ЦК БРСМ.

Начальнік упраўлення па справах моладзі Віталь Брэль, у сваю чаргу, лічыць, што трэба ўсяляк падтрымліваць стварэнне школьных бізнэс-кампаній, бізнэс-інкубатараў і моладзевых школ прадпрымальніцтва. Узорам можа стаць досвед Мінска і Мінскай вобласці. Для прыкладу, на тэрыторыі Мінскай вобласці ў 2011 годзе былі створаны і актыўна функцыянуюць 62 школьныя бізнэс-кампаніі, якія спецыялізуюцца на вытворчасці сувенірнай, друкаванай прадукцыі, падарункаў, арганізацыі выязных свят для дзяцей і г.д.

— Упэўнены, што ў гэтым кірунку мы яшчэ недапрацоўваем. Любая ўстанова адукацыі, а тым больш буйная вышэйшая навучальная ўстанова, могуць адкрыць школы прадпрымальніцтва, стварыць пляцоўкі для развіцця бізнэс-ідэй, вучэбныя цэнтры для моладзі, — падсумаваў Віталь Брэль.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# МНЕ 12 ГАДОЎ, І Я НЕ КУРУ... ПАВОДЛЕ КАНТРАКТА



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Аліна Сярбаева, Паліна Гарбунова, Анастасія Вярковіч і Лізавета Каранда разам з педагогам-псіхолагам.**

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— У нашай школе і раней праводзіліся розныя акцыі, якія заклікаюць да здаровага ладу жыцця. І дзеці ўдзельнічалі, напрыклад, у конкурсе малюнкаў. Але кантракт — зусім іншая форма работы, цікавая і нечаканая для вучняў. Дзецям яна падабаецца, бо яны першы раз у жыцці, як дарослыя, самастойна падпісваюць такі дакумент, — расказала Вольга Жмачынская. — Спачатку, зразумела, такое рашэнне мы абмяркоўвалі з бацькамі. Яны былі не супраць. На паперы, дарэчы, ёсць і подпіс бацькоў. Заключыў кантракты адзін з шостых класаў. Мы прапанавалі гэтую ідэю і некаторым дзецям такога ж узросту, якія стаяць на ўнутрышкольным кантролі.

За невыкананне ўмоў кантракта ніякага пакарання, акрамя выключэння з праекта, не прадугледжана. А вось калі дзіця добрасумленна выконвае ўсе ўмовы, яго за гэта чакае ўзнагарода. Напрыклад, квіткі на КВЗ ці экскурсія.

Але ці не зарана такі кантракт заключаць у дванаццаць гадоў? Можа, даць падпісаць яго старэйшым падлеткам і прадугледзець больш строгую адказнасць за невыкананне ўмоў?

— Старэйшых падлеткаў не зацікавіш гульнёй, і падпісвацца пад абавязацельствам не спрабаваць шкодных звычак яны палічаць нечым несур'ёзным, — тлумачыць Вольга Жмачынская. — Кантракт пэўным чынам распаўсюджваецца і на бацькоў. Вядома, што ў многіх сем'ях курадь таты і мамы. Прымушаць мы не можам, але рэкамендуем ім паспрабаваць кінуць цыгарэту, хоць бы на час дзеяння кантракта сына ці дачкі.

— А раптам хтосьці з шасцікласнікаў захоча «здаць» свайго несумленнага аднакласніка, які кантракт не выканаў?

— Навошта? Нічога страшнага пасля гэтага не адбудзецца. Пакарання ніякага не прадугледжана. Пакуль што ніхто на сяброў не скардзіўся.

...Нарэшце мы дачакаліся перапынку і пайшлі паразмаўляць з вучнямі, якія на цэлы год пазбавілі сябе магчымасці праяўляць цікавасць да любых шкодных «захапленняў». Згадзіліся пагутарыць і сфатаграфавацца Аліна, Паліна, Анастасія, Лізавета і Дзіма.

— Раскажыце, што гэта за паперу вы такую падпісалі?

— Кантракт! Кантракт! — сур'ёзна зазначылі дзеці і разабралі з агульнага стоса лісткі са сваімі прозвішчамі.

Цікаўлюся, што ж рабіць, калі раптам нехта ў класе парушыць тое, пад чым падпісаўся: прамаўчаць, не заўважаць ці расказаць настаўніку?

— Ці раскажу, калі нехта паспрабуе курыць або дрэнна сябе паводзіў? Не ведаю. Мабыць, гэта залежыць ад таго, хто гэта будзе, — прызналася адна з дзяўчат.

— Ваша дамова дзейнічае да летніх канікул. А пасля, калі прапануюць, вы кантракт працягнеце? — задаю пытанне, якое «непакоіла» некаторых маіх калег.

— Так! Так!

Дзеці паступова рабіліся больш гаваркімі.

У класе Аліны, Паліны, Насты, Лізаветы і Дзімы пароўну хлопчыкаў і дзяўчынак. Але, па меркаванні дзяцей, дзяўчынкам вытрымаць умовы кантракта прасцей, і ў гэтым ёсць пэўная перавага. Дзецям па 11-12 гадоў. Літаральна праз годпаўтара яны будуць адчуваць сябе больш дарослымі.

— Скажыце, а якія, па-вашаму, сябры і знаёмыя, што старэйшыя за вас на год ці два?

— Раздражнёныя... Брутальныя... — пачынае разважаць Дзіма.

— А дзяўчаты?

— Ну, нават і не ведаю, як сказаць... Кофтачкі розныя апранаюць, фарбуюцца...

— І чаму ж такая сітуацыя ўзнікае?

— Проста яны дарослымі становяцца, сур'ёзнымі...

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

iNTER-бачанне

# У ПОШУКАХ РОДНАГА СЛОВА,
## АБО ІНТЭРНЭТ ЯК СРОДАК САМАІДЭНТЫФІКАЦЫІ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ

**Ці часта сярэднестатыстычнаму беларусу даводзіцца сустракацца з роднай мовай у рэальным жыцці? (Школу, універсітэт і аддзелы беларускай літаратуры ў кніжных крамах не разглядаем.) Відаць, не вельмі, калі чалавек не чытае беларускамоўных газет і часопісаў і не мае сяброў, якія размаўляюць па-беларуску. У такім выпадку можна хіба што натрапіць на беларускамоўную перадачу па радыё ці тэлебачанні. А калі зазірнуць у інтэрнэт?**

### Два варыянты адной мовы

Беларускую мову нярэдка выкарыстоўваюць карэспандэнты буйных інфармацыйных і забаўляльных інтэрнэт-парталаў (напрыклад, TUT.by), а таксама многія сайты культурнай або літаратурнай накіраванасці («Беларуская палічка» — беларуская электронная бібліятэка). Праўда, часта выкарыстоўваецца неафіцыйны варыянт беларускай мовы — тарашкевіца, якая была ва ўжытку да рэформы правапісу 1933 года. Так, напрыклад, пад назвай «Беларуская мова ў інтэрнэце» існуе каталог рэсурсаў, прысвечаных навінам краіны, у тым ліку літаратуры, культуры, самой мовы, а таксама беларускамоўнаму праграмнаму забеспячэнню, якое ўключае шэраг карысных рэчаў кшталту геаграфічных карт, даведнікаў, слоўнікаў, і нават электронную бібліятэку.

Што датычыцца літаратурных сайтаў, то беларускамоўныя інтэрнэт-бібліятэкі таксама будзе няцяжка знайсці. Але абнаўляюцца яны не вельмі дынамічна, таму многія навінкі лепш шукаць на паліцах кніжных крам.

### Афіцыйна і па-беларуску

Калі гаварыць пра сайты дзяржаўных устаноў, то даволі шмат з іх маюць беларускамоўную версію, аднак часцей асноўны кантэнт можна пачытаць толькі ў рускамоўным варыянце, па-беларуску — толькі некаторыя раздзелы. Напрыклад, для сайта Міністэрства культуры беларуская мова сапраўды родная, у некаторых жа міністэрствах беларускамоўныя версіі/раздзелы амаль адсутнічаюць (напрыклад, беларускамоўнай версіі не мае Міністэрства лясной гаспадаркі, затое сайт мае англамоўны і нямецкамоўны варыянты; сайт Міністэрства ўнутраных спраў таксама амаль не выкарыстоўвае беларускую мову: я змагла знайсці толькі адзін тэкст на гэтым сайце, напісаны па-беларуску).

### «Я паважаю твой выбар»

Сацыяльныя сеткі займаюць значнае месца ў жыцці беларусаў, якія карыстаюцца інтэрнэтам. Нярэдка менавіта старонкі карыстальнікаў «Укантакце», «Фэйсбуку», «Аднакласніках», «Твітэры» і інш. становяцца сродкам самарэалізацыі чалавека. Многія лічаць сваёй мовай беларускую, але, паколькі ў штодзённым жыцці паўсюль гучыць іншая дзяржаўная мова, чалавек часта не гатовы размаўляць па-беларуску: не хапае смеласці, рашучасці або проста па інерцыі ўвесь час пераходзіць на рускую мову. Такія людзі — а іх шмат — часта вядуць свае мікраблогі, старонкі ў сацыяльных сетках або сапраўдныя блогі па-беларуску.

На маю думку, гэта не можа не адбіцца станоўча на паляпшэнні моўнай сітуацыі ў краіне ў цэлым: сябры і знаёмыя беларускамоўных людзей, зыходзячы з правілаў этыкету, часта каментуюць запісы таксама на беларускай мове. Часам старонкі ў такіх сацыяльных сетках, блогах становяцца своеасаблівай стартавай пляцоўкай для пераходу і ў штодзённым жыцці на беларускую мову. І гэта сапраўды робіць байнэт не толькі беларускім, але і часткова беларускамоўным інтэрнэтам.

**Беларуская мова ў інтэрнэце развіваецца абсалютна такім жа чынам, як і кожная сусветная мова: у залежнасці ад сферы і тэмы гутаркі карыстальнікі звяртаюцца да тых ці іншых моўных сродкаў.**

### Мы беларусы. І тым ганарымся

Пытанні пра месца і ролю беларускай мовы ў інтэрнэце я вырашыла задаць людзям, якія маюць непасрэднае дачыненне да яе. Гэта паэт і літаратуразнаўца, кандыдат філалагічных навук Віктар Жыбуль і выкладчык філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Вольга Зуева.

***— Ці развіваецца беларуская мова ў віртуальнай прасторы?***

Віктар ЖЫБУЛЬ (далей В.Ж.):

*— Інтэрнэт у нас ужо даўно назвалі **сеціваМ**, і гэтае слова прыжылося. Яшчэ сустракаў **словасвет** — неалагізм, прыдуманы паэтам Леанідам Дранько-Майсюком. Таксама прыгадваю слова **«мяно»** (ад «мянушка») у значэнні «нік», якое сустракаў на інтэрнэт-форумах.*

**Вядзенне блогаў і асабістых старонак на беларускай мове адлюстроўвае ўсведамленне аўтарам сябе як беларуса, прычым беларускамоўнага, і жаданне заявіць пра гэтае ўсведамленне.**

Вольга ЗУЕВА (далей В.З.):

*— Беларуская мова ў інтэрнэце развіваецца абсалютна такім жа чынам, як і кожная сусветная мова: у залежнасці ад сферы і тэмы гутаркі карыстальнікі звяртаюцца да тых ці іншых моўных сродкаў. У інтэрнэт-тэкстах адлюстраваны ўсе функцыянальныя стылі сучаснай беларускай літаратурнай мовы, шырока прадстаўлена прастамоўе, а таксама макаранічная (жартоўная. — **Заўв. аўт.**) гаворка, русізмы, паланізмы (магчыма, апошнія — з'явы моўнай гульні).*

***— Чаму, на вашу думку, многія людзі вядуць свае блогі і старонкі ў сацыяльных сетках на беларускай мове, а ў рэальным жыцці карыстаюцца рускай?***

В.Ж.:

*— Гэта чыста псіхалагічны момант. У рэальным жыцці чалавек можа і не супраць размаўляць пабеларуску, але саромеецца, а запіс у блогу ці на старонцы патрабуе нашмат менш псіхалагічных намаганняў. Да таго ж парталы, сайты, форумы — яны збольшага інтэрнацыянальныя, на іх заводзяць сабе старонкі альбо пакідаюць паведамленні людзі з розных краін, прадстаўнікі розных нацыянальнасцяў. І вось тут беларусы — нават рускамоўныя — адчуваюць патрэбу як-небудзь абазначыць, падкрэсліць сваю нацыянальную прыналежнасць. Таму многія суайчыннікі на персанальных старонках змяшчаюць пра сябе інфармацыю менавіта па-беларуску, родная мовай пазначаючы таксама, натуральна, беларускую. Ці, напрыклад, пішуць па-беларуску свае імя і прозвішча (або лацінкай у беларускай транскрыпцыі), хоць усё астатняе могуць пісаць і па-руску (або на дзвюх мовах).*

В.З.:

*— Вядзенне блогаў і асабістых старонак на беларускай мове адлюстроўвае ўсведамленне аўтарам сябе як беларуса, прычым беларускамоўнага, і жаданне заявіць пра гэтае ўсведамленне. Чалавек заўсёды імкнецца арганізаваць сваю камунікатыўную прастору адэкватным для сябе чынам, і ў віртуальнай рэальнасці гэта зрабіць проста. Калі чалавек пры гэтым не размаўляе «ў жыцці» на беларускай мове, магчыма, ён пакуль што знаходзіцца на першым, пачатковым этапе гэтага ўсведамлення. А калі фарміраванне яго самасвядомасці ўжо скончылася, у такім выпадку гэты выбар адлюстроўвае згоду чалавека з двухмоўем (вымушаную, непазбежную альбо добраахвотную, без усялякай драматызацыі гэтага факту).*

***— Дзе часцей беларус сустракаецца з роднай мовай: у рэальным жыцці ці ў інтэрнэце?***

В.Ж.:

*— Напэўна, відаць, у інтэрнэце. Бо, заходзячы ў сеціва, чалавек ужо звычайна ведае, якія сайты/парталы/форумы будзе наведваць, з кім будзе камунікаваць і г. д. А ў рэальным жыцці ўсё больш падпарадкавана выпадковасці: ён выйдзе з дому, паедзе на працу ў грамадскім транспарце, і... ужо як пашанцуе — можна сустрэць па дарозе каго-небудзь беларускамоўнага, а можна і не сустрэць. Прынамсі, на людзях, якія ў рэальным жыцці, скажам, ходзяць па вуліцы, не напісана, беларускамоўныя яны ці не, а ў інтэрнэце — напісана ў літаральным сэнсе (у профілі і г. д.). Так што ў сеціве чалавеку прасцей і паказаць сябе як ёсць, і знайсці аднадумцаў. Хаця часта бывае і наадварот: людзі дэманструюць не сябе, а прыдуманых віртуальных персанажаў пад рознымі нікамі. Але гэта ўжо іншы бок справы.*

В.З.:

*— Паняцце «беларус» шырокае. Цяжка абагульнена сказаць, дзе беларусы часцей сустракаюцца з роднай мовай, бо няма «сярэднестатыстычнага беларуса». Хтосьці слухае беларускае радыё і глядзіць пазнавальныя перадачы па тэлебачанні, хтосьці мае зносіны ў «сваёй» беларускамоўнай кампаніі і наведвае «свае» мерапрыемствы, хтосьці чытае беларускамоўныя кнігі і сайты, хтосьці вучыцца і выкладае на роднай мове, а нехта толькі чуе аб'явы ў грамадскім транспарце. Моўная сітуацыя ў краіне, як вядома, неадназначная.*

***— Ці ў стане беларускамоўны байнэт паўплываць на моўную сітуацыю?***

В.Ж.:

*— Думаю, што ў стане. Ён — сродак згуртавання людзей па любым прынцыпе. У тым ліку і моўным. Але трэба развіваць і «невіртуальныя» беларускамоўныя асяродкі.*

В.З.:

*— На мой погляд, байнэт ніякім чынам не можа паўплываць на моўную сітуацыю ў краіне. Моўная сітуацыя фарміруецца і рэгулюецца выключна грамадска-палітычнымі намаганнямі. Інтэрнэт — гэта прастора (віртуальная), і беларуская мова — знакавая сістэма для зносін на гэтай прасторы. Беларусь — гэта таксама прастора (рэальная), і беларуская мова — знакавая сістэма для зносін на гэтай прасторы. Меркаванне пра тое, што інтэрнэт можа паўплываць на моўную сітуацыю ў краіне, раўназначна меркаванню, нібы сама краіна як прастора можа паўплываць на гэта. Насамрэч на сітуацыю ўплываюць палітыкі, асобы, якія маюць рэальную грамадскую сілу.*

...Як бачым, сусветнае павуцінне часам дае магчымасць беларусам зрабіць першы крок для таго, каб стаць беларусамі беларускамоўнымі. Але толькі першы крок. Далей усё залежыць ад самога чалавека.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

Без гучных слоў

# ВЯЛІКАЯ СПРАВА МАЛЕНЬКІХ ЛЮДЗЕЙ

**Калісьці «Звязда» расказала аб супрацоўніцтве Беларускай асацыяцыі былых непаўналетніх вязняў фашызму з нямецкім таварыствам «Кантакты». Кіраўніцтва замежнай арганізацыі прапанавала беларусам паўдзельнічаць у праекце «Школьнікі дапамагаюць былым прымусовым работнікам і іншым ахвярам нацызму». Беларусы згадзіліся. Так дзесяцікласнікі сталічнай сярэдняй школы № 137 імя Машэрава пачалі наведваць хворых старых, дапамагаць ім, слухаць і запісваць іх аповеды...**

Прайшло 8 гадоў. Нямецкае таварыства больш не супрацоўнічае з беларусамі. Праект, які афіцыйна падтрымліваўся нямецкім дзяржаўным фондам «Памяць, адказнасць і будучыня», ужо не фінансуецца. Відаць, немцы палічылі, што і так нямала зрабілі для беларускага боку. Далей магчымасць прадставіць нашу краіну ў міжнародных праектах, арганізаваць экскурсію ў Асвенцым, пэўны час забяспечваў былых вязняў прадуктамі і падарункамі, апладзілі некаторым лячэнне, нават вярнулі адной бабулі магчымасць бачыць, прафінансаваўшы аперацыю на вочы...

Аднак вучні 137-й школы і сёння працягваюць дапамагаць былым малалетнім вязням канцлагераў і іншых месцаў прымусовага ўтрымання. Праўда, ужо без фінансавай падтрымкі.

Настаўніца гісторыі 137-й школы Людміла Шэнікава быццам прадбачыла гэта. Тады, у 2004 годзе, яна так адказала на пытанне нашага журналіста: «Нават калі нямецкі бок спыніць удзел у праекце, мы будзем працягваць яго сваімі сіламі. Напэўна, ужо не зможам купляць сваім падапечным падарункі і прадукты, але ж добрыя справы, пагадзіцеся, трымаюцца не толькі на гэтым. Людзі, з якімі працуюць сёння дзеці, — апошнія ахвяры нацызму, апошнія сведкі яго зверстваў. Таму наш абавязак — аблегчыць хаця б апошнія гады іх жыцця».

Словы стрымалі. У найбольш нямоглых дзеці прыбіраюць у кватэры, мыюць вокны, ходзяць у краму па прадукты, у аптэку — па лекі... Усіх віншуюць са святамі, запрашаюць на школьныя мерапрыемствы. Проста з імі размаўляюць... А пад апекай школьнікаў ужо не 15 чалавек, як было раней. Да іх далучыліся і іншыя вязні, а таксама ўсе ветэраны Вялікай Айчыннай вайны Першамайскага раёна. А гэта ні многа ні мала, а каля дзвюх соцень набярэцца!

І школьнікаў, а дакладней, валанцёраў (так іх сёння называюць), гэта не пужае. Не ўсе ж з ахвяр фашызму хворыя і адзінокія! Некаторым з іх дастаткова звычайнай увагі: віншавальнай паштоўкі, добрага слова ці проста прысутнасці, каб было каму выгаварыцца, часам выплакацца.

**Вельмі важна проста прыйсці і пагаварыць з чалавекам. Успомніць, наведаць, павіншаваць. Было б толькі жаданне!**

— Па сутнасці, каб дапамагаць людзям, сіл вялікіх прыкладаць не трэба, — упэўнена **дырэктар 137-й школы Ніна ШЫЛАВА.** — Вельмі важна проста прыйсці і пагаварыць з чалавекам. Успомніць, наведаць, павіншаваць. Было б толькі жаданне!

На базе школы нават арганізавалі хор «Лёсы», выканаўцамі якога сталі былыя малалетнія вязні і ветэраны вайны. Энергічнасці, бадзёрасці і аптымізму бабуль і дзядуляў, якія выступаюць на розных сцэнах горада, могуць пазайздросціць многія маладыя. Праўда, у сувязі з працяглым рамонтам школы, якая не можа пакуль прадаставіць удзельнікам хору ні пляцоўкі, ні кіраўніка, садзейнічанне калектыву аказвае адміністрацыя Першамайскага раёна.

Праз школу прайшло ўжо 9 пакаленняў валанцёраў. Сённяшнія школьнікі працягваюць справу сваіх папярэднікаў. Вядома, не ўсе, а толькі добраахвотнікі: не кожны лічыць патрэбным дапамагаць былым вязням, а ў такой справе прымусу быць не можа.

Вучні ўдзельнічаюць у акцыях «Памяць», прыбіраюць пахаванні, замацаваныя за школай, — брацкую магілу і магілу Пятра Міронавіча Машэрава. Неабыякавыя да дзейнасці сваіх дзяцей і бацькі, якія дапамагаюць у тым ліку і матэрыяльна.

(Заканчэнне на 7-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
06 12 2012 г.

# «РАДАВАЦЦА ЖЫЦЦЮ...»



Фота БЕЛТА.

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

— Каб трапіць у грымёркі, патрабавалася спецыяльная акрэдытацыя — туды мелі доступ кіраўнік дэлегацыі, урач, калі ён быў патрэбны, харэограф, каардынатар конкурсу і самі ўдзельнікі. Нават педагог па вакале змог да нас прарвацца толькі адзін раз. Але пры гэтым дзяцей празмерна не апякалі, і яны мелі магчымасць заставацца дзецьмі.

Не будзем падманвацца: многім беларускім балельшчыкам было дзіўна, незразумела і крыху крыўдна чуць ацэнкі. Нават у пасла Беларусі ў Нідэрландах Алены Грыцэнкі, якая прысутнічала з мужам на фінале дзіцячага «Еўрабачання», зусім недыпламатычна акругліліся вочы. «Вы бачылі, калі пасля абвяшчэння вынікаў усе ўдзельнікі выйшлі на сцэну? Нашы дзеці, хоць і перажывалі падчас выстаўлення балаў, але не выглядалі засмучанымі, — адзначае Ірына Жэшка, не тоячы, што ганарыцца сынам і яго сябрамі. — Дый і самі арганізатары стараліся адцягнуць момант спаборніцтва, памкнення да перамогі на другі план. І, напэўна, добра, што галоўны прыз — гэта простая памятная статуэтка з эмблемай конкурсу. Так, заслужаная перамога — гэта класна. І сёлета Насця Петрык — безумоўна, малайчына. Гэтая дзяўчынка сапраўды была наймацнейшай. А наконт астатняга можна шмат спрачацца, хто быў лепшым, а хто горшым».

— Слабых удзельнікаў там не было, — сур'ёзна разважае Ягор. — У кагосьці быў выдатны нумар, у кагосьці — песня, у кагосьці — голас... Мне спадабаўся нумар Грузіі, выступленне Фабіяна з Бельгіі, запомнілася песня Нідэрландаў (напявае): «Цік-так...»



Марская свінка Міня жыве ў сям'і ўжо 5 гадоў. «Часам мама прыносіць яе ў пакой, дзе я іграю на піяніна. Калі чыста іграю, Міня можа парагатаць, а калі памыляюся — хаваецца ў мамы пад пахай», — смяецца хлопец.

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**— Кажуць, тваю песню развучыла і выконвала галандская спявачка?**

— Так, яе тата падабраў на гітары акорды, а Фемке спявала.

## ПРА СЯБРОЎ І МУЗЫЧНЫЯ ПРЫХІЛЬНАСЦІ

Ягор Жэшка вучыцца ў той жа сталічнай гімназіі, з якой налета выпускаецца першая беларуская пераможца дзіцячага «Еўрабачання» Ксенія Сітнік. Але, як ні дзіўна, да конкурсу яны ніводнага разу «не перасякаліся». «Я ў гэтай чвэрці ўвогуле ў школе не быў: спачатку моцна хварэў, потым пастаянна рэпеціраваў, а там ужо мы адправіліся на само «Еўрабачанне». З былых удзельнікаў пагаварыў хіба што з Лідай Заблоцкай, якая выступала летась».

**— З кім у першую чаргу ты сазваніўся пасля вяртання ў Мінск?**

— Патэлефанавала старэйшая сястра, распытала, як справы, як самаадчуванне. З бабуляй пагутарыў. Са школы пакуль што ні з кім не звязваўся: магчыма, там яшчэ нават не ведаюць, што мы вярнуліся. Аднакласнікі — гэта асобная гаворка: многія з іх не цікавяцца «Еўрабачаннем» і ўвогуле нічым, акрамя вучобы і ўласных заняткаў. Ёсць чалавек 8-10 добрых сяброў, якім заўжды цікава, што адбываецца ў маім жыцці. Менавіта яны і падтрымліваюць мяне.

— У інтэрнэце пішуць словы падтрымкі нават тыя людзі, хто спачатку не вельмі прыязна ставіўся да песні Ягора, — зазірае ў гасціную тата Іван Анатольевіч.

— Многія спачатку пісалі: маўляў, голас ёсць, а песня абы-што, незразумелая і ўвогуле ніякая. Памятаю, была нават спрэчка. Адзін казаў, «трэба было спяваць пра любоў да нашай краіны, нашы прасторы, палі і лясы». «І пра нашы балоты і жабак», — дадаваў другі. Словам, хапала негатыўных водгукаў на тое, што менавіта я прайшоў ад Беларусі. Але былі і вельмі прыязныя.

**— Дарэчы, пра любоў да краіны. Як у цябе з беларускамоўным рэпертуарам?**

— Па мерках прафесіяналаў, я займаюся вакалам вельмі мала — усяго два гады. І рэпертуар яшчэ невялікі, цалкам падрыхтаваных, не «сырых» беларускамоўных песень у ім пакуль няма. Падабаецца «Касіў Ясь канюшыну». Яна забаўная, вясёлая, але выкладчык чамусьці не хоча са мной яе развучваць. А вось «Рэчаньку», наадварот, ледзьве пачуў, адразу пачаў пераконваць: «А давай, Ягор, развучым!». Песня добрая, не адмаўляю, але развучыць яе як след мы яшчэ не паспелі. У мяне самога больш ляжыць душа да «Купалінкі».

**— Я звярнула ўвагу, што ў тваёй анкеце ў графе «Любімыя артысты» — Вітас, Мікалай Баскаў, Рыкі Марцін, а беларускіх артыстаў няма. Сапраўды нікога не слухаеш?**

— Анкету мы запаўнялі для арганізатараў «Еўрабачання», з разлікам на тое, каб гэтых артыстаў больш ці менш ведалі ў Еўропе. Мне падабаюцца Лучана Паварoці, Патрысія Каас, а нашы... Хіба Дзмітрый Калдун? (*Бацькі адкрылі нам сакрэт: Ягор вельмі хацеў бы праспяваць з Дзімам Калдуном дуэтам.* — **Аўт.**).

Акрамя выступленняў на эстрадзе, у Ягора Жэшкі ёсць, няхай і маленькі, музычна-тэатральны вопыт. Напрыклад, у мюзікле «Чыпаліна» ён выконваў ролю графа Вішанькі. «Безумоўна, спадабалася — і праца ў камандзе, і новыя сябры. Калі яшчэ выпадзе магчымасць, з задавальненнем паўдзельнічаю».

## РАСКЛАД НА ПАСЛЯЗАЎТРА

**— А што далей, вы абмяркоўвалі ўжо з педагогам? Дасце голасу адпачыць напярэдадні мутацыі альбо яшчэ паўдзельнічаеце ў якім-небудзь конкурсе?**

— Мы з Валерам Шматам (*выкладчык Ягора, мастацкі кіраўнік арт-гурта «Беларусы»* — **Аўт.**) яшчэ не вырашалі наконт конкурсаў, але да канца года, думаю, будзем адпачываць. На пачатку наступнага года, верагодна, паедзем у Закапане — ужо некалькі месяцаў таму даслалі запрашэнне выступіць у якасці ганаровага госця. Хочацца, вядома, зноў паўдзельнічаць у адборы на «Новую хвалю», тым больш, што я атрымаў там прыз глядацкіх сімпатый. Але гэта яшчэ аддаленыя планы, пра якія рана ўсур'ёз казаць.

**— Добра, тады пра планы больш блізкія. У цябе праз некалькі тыдняў дзень народзінаў. Што хацелася б атрымаць у падарунак?**

— ...*(Надоўга задумваецца.)* Ды ў мяне ўсё ёсць! Марская свінка, пра якую 3 гады марыў ёсць, планшэт ёсць, кніжкі ёсць, на «Еўрабачанне» з'ездзіў... Усе мары, можна сказаць, збыліся.

**— Што ты параіў бы наступнаму беларускаму ўдзельніку дзіцячага «Еўрабачання»?**

— Радавацца жыццю і заставацца самім сабой.

## БЛІЦ ДЛЯ БАЦЬКОЎ

Бацька Ягора кажа, што сын — баец, а мама сцвярджае, што ён — вельмі сціплы хлопчык. Як гэта сумяшчаецца?

— Адно другому не перашкаджае, — упэўнена Ірына Жэшка. — Можна быць байцом, але пры гэтым заставацца выхаваным чалавекам, які паважае меркаванне іншых і дастаткова крытычна ставіцца да сябе самога.

**У нас выдатныя дзеці.
І наша, дарослых, задача —
не рэалізоўваць
за іх кошт свае амбіцыі,
а дапамагчы дзіцячым
талентам раскрыцца.**

**— Калі Ягор вырашыць — кіну я спяваць, пайду зноў у каратэ — вы будзеце супраць?**

— Мы вырашылі, што не будзем умешвацца ў жаданне дзяцей займацца чымсьці, калі гэта, зразумела, годныя заняткі. І старэйшая дачка займалася тым, што лічыла патрэбным. У Ягора пакуль няма канчатковай вызначанасці ў будучай прафесіі і ёсць час падумаць. Калі пасля мутацыі ў яго застанецца жаданне пець і вучыцца гэтаму прафесійна — мы яго падтрымаем ва ўсім. Ужо цяпер відаць, што сын не матэматык ці фізік, а, хутчэй, гуманітарый.

**— Кожным бацькам прыемна, калі іх дзіця дасягае пэўных поспехаў, але, з іншага боку, ёсць засцярога пазбавіць яго дзяцінства... Як вы знаходзіце баланс?**

— Сучасныя дзеці і так дастаткова рана становяцца дарослымі. Напэўна, каб не прагледзець, калі дзяцінства скончылася і перад табой ужо дарослы, трэба проста быць побач з імі, любіць сваіх дзяцей, прыслухоўвацца да іх жаданняў і даваць ім досыць увагі.

## ЗАМЕСТ ПАСЛЯСЛОЎЯ

За амаль 10 гадоў, што я назіраю за дзіцячым «Еўрабачаннем,» так і не змагла ўразумець, па якіх крытэрыях мы самі ацэньваем сваіх удзельнікаў. У 2005-м, калі за конкурсам яшчэ мала хто сачыў, перамога Ксюшы Сітнік была як гром сярод яснага неба. Ад усіх паслядоўнікаў ужо чакалі — а потым і патрабавалі — поспехаў. І цяпер любое занятае месца, акрамя першага (яшчэ другое можам дараваць), успрымаецца ледзьве не як нацыянальная ганьба. А можа, варта інакш?

Напрыклад, сёлетнія ўдзельнікі адзначылі дэталь, якая добра ілюструе розніцу ў падыходзе да конкурсу. Тэлебачанне Нідэрландаў запрасіла выступіць на фінале дзіцячага «Еўрабачання» ўсіх удзельнікаў свайго адборачнага тура. Разумееце? Не сусветных знакамітасцяў, не сваіх папулярных поп-«зорак», а сваіх таленавітых дзяцей. І няхай у тэлетрансляцыю гэта частка канцэрта не ўвайшла, затое кожны з удзельнікаў мог адчуць сябе вялікім артыстам на вялікай сцэне.

А той факт, што сёлета Ягору Жэшку не пашанцавала (я буду настойваць менавіта на гэтым вызначэнні) не дае нікому права лічыць, што юныя беларускія артысты за кагосьці горшыя. У нас выдатныя дзеці. І наша, дарослых, задача — не рэалізоўваць за іх кошт свае амбіцыі, а дапамагчы дзіцячым талентам раскрыцца. Тады ўсё атрымліваецца, як сведчыць практыка.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# МАРОЗЫ-ВІРТУОЗЫ

**На сцэне Гомельскага абласнога Палаца творчасці дзяцей і моладзі святочныя праграмы на конкурс «Ёлка-фэст-2012» прадставілі 32 каманды з розных рэгіёнаў. Педагогі школ і ўстаноў дадатковай адукацыі на працягу пяці гадзін даказвалі, што менавіта іх Дзед Мароз і Снягурка — лепшыя за іншых.**

Пераможцамі сталі прадстаўнікі гімназіі Петрыкава Аляксандр Чычыкайла і Юлія Кулак. Яны паказалі і яркае шоу, і цікавыя касцюмы. Гледачоў прывяло ў захапленне з'яўленне на сцэне валёнак-бегуноў вышынёй з чалавечы рост. Дзед Мароз растлумачыў, што ў яго дзве пары абутку — валёнкі-бегуны і офісны варыянт. Як расказала загадчык арганізацыйна-масавага аддзела Палаца творчасці дзяцей і моладзі Любоў Калацэй, другімі па выніках агляду прызнаны супрацоўнікі Акцябрскага раённага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі. Трэцяе месца падзялілі паміж сабой Рэчыцкі і Уваравіцкі (Буда-Кашалёўскага раёна) цэнтры творчасці дзяцей і моладзі. Снягурка з Рэчыцы скарыла гледачоў і журы мілавіднасцю і вакалам, а музычны Дзед Мароз з Уваравічаў віртуозна іграў на саксафоне.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# МОЛАДЗЕВАЯ «СКАРБОНКА ІДЭЙ»

**У рамках рэалізацыі моладзевага рэспубліканскага праекта «100 ідэй для Беларусі» ў Віцебскай вобласці фарміруецца «Скарбонка ідэй».**

— Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі працягвае рэалізацыю рэспубліканскага моладзевага праекта «100 ідэй для Беларусі» на лепшую інавацыйную ідэю ў розных сферах сацыяльнага і эканамічнага развіцця краіны, цікавую для практычнай рэалізацыі, — расказалі ў Віцебскім абласным камітэце БРСМ. — Саюз моладзі запрашае да ўдзелу ў праекце маладых людзей ва ўзросце ад 14 да 31 года. У «пярвічках» арганізацыі ствараецца «Скарбонка ідэй». І кожны ахвотны можа папоўніць яе сваёй ідэяй.

Вопыт рэалізацыі цікавых прапаноў на Віцебшчыне ўжо ёсць. У прыватнасці, раней падтрымалі праект экалагічнага тэатра на колах, які дзейнічае пры школе ў населеным пункце Доўжа Віцебскага раёна. Спецыялісты высока ацанілі праект па аўтаматызаванай сістэме ўліку руху лічыльнікаў электрычнай энергіі, аўтарамі якога сталі маладыя навукоўцы віцебскага інстытута тэхнічнай акустыкі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі.

Заяўкі для ўдзелу ў папаўненні «скарбонкі» можна адправіць на адрас: vitebsk_100@tut.by. Можна прадставіць і ў друкаванай форме (прынесці ў пярвічныя арганізацыі або райкамы БРСМ).

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ЗРАЗУМЕЕШ КУЛЬТУРУ — ЗНОЙДЗЕШ СЯБРА

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

Ван Лінь, зямлячка «клубнага артыста», выканала кітайскі народны танец «Маладая дзяўчына», паказаўшы вялікую ролю традыцый у кітайскім грамадстве. А вось кітайскія студэнты з Акадэміі музыкі стварылі ў зале атмасферу далёкай Аргенціны. Танга (дуэт скрыпкі і фартэпіяна) было сапраўды хвалюючым і загадкавым. Не абышлося і без кур'ёзу: пасля таго, як дуэт атрымаў кветкі і падарунак, хлопцы чамусьці не сыходзілі, а працягвалі стаяць на сцэне. Відаць, спадабаліся авацыі публікі?

## «Студэнткай БДУ быць прэстыжна...»

Туркменаў у Беларусі вучыцца таксама нямала. І гледачоў яны парадавалі некалькімі нумарамі: ігрой на фартэпіяна, танцам джыгіта ў выкананні хлопцаў і танцам «Галпініі» ў выкананні дзяўчат. Джэйран Шамухамедава, студэнтка першага курса спецыяльнасці «Рамана-германская філалогія» філалагічнага факультэта БДУ, расказала пра сваю вучобу ў нашай краіне:

— У Беларусі вучыцца вельмі шмат туркменаў, таму я таксама вырашыла атрымаць тут адукацыю. У выніку я паступіла на філалагічны факультэт БДУ, тым больш, што быць студэнтам гэтай навучальнай установы вельмі прэстыжна. Каб развіваць сваю рускую мову, папрасіла, каб мяне залічылі ў групу беларускіх студэнтаў. Яны ставяцца да мяне ўважліва і дружалюбна, а калі мне што не зразумела — тлумачаць. Выкладчыкі таксама вельмі падабаюцца.







## «Разынка» хору «Дамінанта»

Асобна трэба спыніцца на выступленні інтэрнацыянальнага хору «Дамінанта» з Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта. Яго дырыжор — Філіпус Ітэмбу з Намібіі, студэнт чацвёртага курса, а мастацкі кіраўнік — Ірына Фацьянава. Чыстыя галасы гучалі надзвычай зладжана. Паказальна, што ўдзельнікі хору паходзяць з розных краін: Намібіі, Лівана, Камеруна, Нігерыі, Літвы, Украіны, Туркменістана і, натуральна, з Беларусі. Пра хор распавяла **Ала Шарапа, старшыня Асацыяцыі замежных выпускнікоў БДМУ, куратар і педагог-арганізатар хору «Дамінанта»**:

— Хору ўжо шэсць гадоў. Гэта адзіны інтэрнацыянальны хор не толькі ў Беларусі, але і ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў! Калі да мяне прыйшлі студэнты з Нігерыі (а іх было каля 20), я выкладала ў іх рускую мову і рыхтавала вечар для першакурснікаў «Давайце пазнаёмімся». Пачуўшы іх спевы — а самадзейнасцю я займаюся больш за 30 гадоў, — адразу зразумела, што тэрмінова трэба стварыць хор. А праз два гады ў хоры былі ўжо прадстаўнікі 13 краін свету. Зараз тут спяваюць і нашы выпускнікі — Абрахам Джэрэмая з Нігерыі, урач-уролаг, ардынатар і Анастасія Бандарэнка, урач-анестэзіёлаг. Дарэчы, у нашым хоры ёсць пяць інтэрнацыянальных сем'яў, у якіх падрастаюць дзеці.

## Рытмы нігерыйскага карнавалу

Упершыню ў фестывалі прыняў удзел студэнт з Малайзіі. Макеш Муту Ірупан выступіў з валынкай. Сваімі выступленнямі ўзрушылі аўдыторыю студэнты з Азербайджана і Ірана, а нігерыйскі студэнт яркім песенным нумарам не толькі ўскалыхнуў залу, але і прымусіў падтанцоўваць і падпяваць яму з залы сваіх землякоў. Магчыма, нумар ствараўся пад уплывам карнавальных традыцый (штогод у лістападзе ў Абуджы, сталіцы Нігерыі, праходзіць карнавал). Так ці не, але выступленне атрымалася выдатным.

## Дыялог пад «Васільковым небам»

Фінальным выступленнем стала «Васільковае неба» ў выкананні спявачкі з Кубы Луселіі Ролдан: песня прагучала вельмі шчыра і амаль без акцэнту. Нездарма Луселія атрымала на «Славянскім базары — 2012» прэмію імя У. Мулявіна «За лепшае ўвасабленне нацыянальнай тэмы і высокае выканаўчае майстэрства».

Фестываль нацыянальных культур — міжуніверсітэцкі, нацыянальны ці міжнародны — не проста канцэрт з удзелам прадстаўнікоў розных нацыянальнасцяў. Гэта вельмі важны крок да разумення іншай культуры: рознай і, разам з тым, мы ўсе — вельмі-вельмі падобныя.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.**

*Паважай чужое*

# ЗАКОНЫ ГАСЦІННАСЦІ НЕ АДМЯНЯЮЦЬ ПРАВАВЫЯ НОРМЫ



**Не сакрэт, што да студэнцкага жыцця прасцей адаптавацца таму, хто жыве ў тым жа горадзе, дзе і вучыцца. А вось іншагароднім студэнтам даводзіцца несалодка. Што тады казаць пра замежнікаў, якія едуць за тысячы кіламетраў ад радзімы: незнаёмая культура, чужы моўны асяродак, зусім іншы клімат...**

Разумеюць гэта і прадстаўнікі навучальных устаноў нашай краіны. Выкладчыкі па першым часе закрываюць вочы на пропускі, не звяртаюць увагі на дрэнную падрыхтоўку замежнікаў (маўляў, мовы яшчэ не ведаюць). У інтэрнатах, спасылаючыся на тое ж няведанне, не звяртаюць увагі на парушэнні дысцыпліны. Аднак жа кажуць: «Няведанне законаў не вызваляе ад адказнасці». І замежнікі тут — не выключэнне.

Невыпадкова днямі ў Ліцэі БДУ адбылася сустрэча прадстаўнікоў рэктарата і структурных падраздзяленняў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС з замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія сёлета прыбылі на навучанне ў галоўную ВНУ краіны. Абмяркоўваліся пытанні адаптацыі замежнікаў у адукацыйным асяродку, іх прававое і сацыяльнае палажэнне. Замежным студэнтам расказалі аб правілах пражывання ў студэнцкім гарадку. Прапанавалі розныя варыянты баўлення вольнага часу. Падзяліліся некаторымі новаўвядзеннямі і планамі на будучыню.

— З наступнага года ў замежных студэнтаў пасля атрымання вышэйшай адукацыі з'явіцца магчымасць прайсці праграму падрыхтоўкі ў магістратуры на англійскай мове, — паведаміў **першы прарэктар БДУ Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**. — Я думаю, калі вы падыдзеце да 5-га курса, мы будзем ужо ў Балонскай сістэме адукацыі. Але ў студэнтаў ужо сёння ёсць магчымасць паехаць на стажыроўку ў іншыя краіны.

Як аказалася, праблема з месцамі ў інтэрнатах хвалюе не толькі беларускіх студэнтаў. Калі на першым курсе ўсе замежнікі забяспечаны інтэрнатам, то на старэйшых курсах некаторым прыходзіцца здымаць кватэру. Міхаіл Жураўкоў запэўніў, што пасля рамонту інтэрната № 3 жыллёвае пытанне вырашыцца для большасці і замежных, і беларускіх студэнтаў.

— У планах універсітэта да 2015 года пабудаваць інтэрнат павышанага камфорту, — расказаў першы прарэктар. — Пераважна ён будзе разлічаны на замежных студэнтаў старшых курсаў, якія маюць магчымасць заплаціць даражэй, чым за звычайны інтэрнат.

Задача кіраўніцтва БДУ — не толькі заахвоціць замежных студэнтаў да навучання, але і стварыць для іх аптымальныя ўмовы. Не сакрэт, што значную долю бюджэту БДУ складае экспарт адукацыйных паслуг. Летась аб'ём валютных сродкаў, атрыманых універсітэтам ад усіх формаў навучання замежных грамадзян, склаў больш за 5,6 млн долараў. А за 6 месяцаў гэтага года дзякуючы замежным студэнтам БДУ папоўніў бюджэт амаль на 2 млн долараў.

Зацікаўленыя ў адукацыйных паслугах універсітэта і замежныя грамадзяне. Для большасці з іх навучанне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце — магчымасць атрымаць прэстыжнае працоўнае месца ў сваёй краіне.

**Летась аб'ём валютных сродкаў, атрыманых універсітэтам ад усіх формаў навучання замежных грамадзян, склаў больш за 5,6 млн долараў. А за 6 месяцаў гэтага года дзякуючы замежным студэнтам БДУ папоўніў бюджэт амаль на 2 млн долараў.**

— Пра магчымасць вучыцца ў Беларусі я даведалася з дзяржаўных СМІ, — расказвае студэнтка 1 курса юрыдычнага каледжа БДУ, жыхарка Туркменістана Джахан. — Нягледзячы на тое, што атрыманне вышэйшай адукацыі ў Туркменістане бясплатнае, здала ўступныя іспыты і па дзяржаўнай праграме паступіла ў каледж. У нас таксама высокі ўзровень вышэйшай адукацыі, аднак я ўсё жыццё марыла вучыцца за мяжой. Беларусь — надзейная краіна, а вучыцца ў БДУ — вельмі прэстыжна.

Джахан прыехала ў Беларусь разам з сябрамі. Для іх таксама важна атрымаць менавіта дыплом БДУ. Пасябравала дзяўчынка і з беларускімі студэнтамі. Кажа, што яны вельмі добрыя, заўсёды дапамагаюць у вучобе. У вольны час туркменка знаёміцца не толькі з рускай, але і з беларускай літаратурай. Зацікавіла дзяўчыну творчасць Кузьмы Чорнага. Пасля заканчэння ўніверсітэта Джахан вернецца на Радзіму, дзе з дыпломам БДУ ёй усюды будзе адкрыта дарога.

А пакуль наперадзе яшчэ чатыры гады навучання ў каледжы і два — ва ўніверсітэце. Доўгі шлях. Таму пазнаёміцца з беларускім заканадаўствам лішнім не будзе.

— Замежны грамадзянін, які прыехаў у Беларусь, на працягу 5 дзён пасля прыбыцця абавязаны прайсці рэгістрацыю ў міграцыйных органах па месцы меркаванага пражывання, — падкрэсліў **першы намеснік начальніка дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі МУС — начальнік упраўлення па рабоце з замежнымі грамадзянамі, асобамі без грамадзянства і міграцыі Ігар ІГНАТОВІЧ**. — Дарэчы, адміністрацыйнае спагнанне ў выглядзе штрафу прадугледжвае пакаранне да 200 еўра. Калі замежны грамадзянін 5 разоў прыцягнуты да адказнасці за любое адміністрацыйнае правапарушэнне, міграцыйныя органы пачынаюць працэс анулявання дазволу на часовае пражыванне. У выніку замежны грамадзянін, у тым ліку студэнт, падлягае дэпартацыі на тэрмін ад 5 да 10 гадоў.

На шчасце, такіх выпадкаў сярод замежных студэнтаў амаль не бывае. Аднак і яны не без граху. Адно з асноўных правапарушэнняў — невыкананне правілаў дарожнага руху. У апошні час студэнты-замежнікі пачалі актыўна набываць аўтатранспартныя сродкі, прычым не лічачы патрэбным падпарадкоўвацца міжнародным стандартам руху. Прадстаўнік дэпартамента засяродзіў увагу на тым, што пяць правапарушэнняў правілаў дарожнага руху вядуць да дэпартацыі. А кіраванне транспартным сродкам у стане алкагольнага ап'янення — да неадкладнай высылкі за межы краіны.

Начальнік аддзела па рабоце з замежнымі грамадзянамі ўпраўлення міжнародных сувязяў БДУ Надзея Кунец папярэдзіла замежных студэнтаў, што зараз адміністрацыя факультэтаў будзе ўзважана падыходзіць да просьбаў студэнтаў датэрмінова здаць сесію, паехаць дадому раней, а прыехаць пазней. «Мы дыпломы не прадаём — іх патрэбна зарабіць», — падкрэсліла Надзея Аляксееўна.

Дзеля гэтага ў Беларусь якраз і прыехалі замежныя студэнты. Паводле сацыялагічнага даследавання, праведзенага ўпраўленнем міжнародных сувязяў, сярэднестатыстычным замежным студэнтам, якія паступілі ў БДУ, часцей за ўсё з'яўляецца юнак, вучобу якога аплачваюць бацькі з сярэднімі даходамі. Звычайна гэта дваццацігадовы хлопец з Кітая ці Туркменістана, які атрымлівае адукацыю па сацыяльна-гуманітарным профілі. У большасці выпадкаў пра БДУ яны даведаліся са слоў родных і сяброў, якія раней вучыліся ў Беларусі.

Вельмі сімвалічна, што людзі пераадольваюць сотні, нават тысячы кіламетраў, каб вучыцца тут, на беларускай зямлі. А мы часам, наадварот, пакідаем сваю краіну, шукаючы лепшага жыцця. Відаць, не памыліўся той, хто казаў: «Добра там, дзе нас няма», маючы на ўвазе якраз адваротнае...

**Вераніка КАНЮТА.**

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
06 12 2012 г.

# ЗАЯВІЦЬ ПРА СЯБЕ МОВАЙ КОМІКСАЎ І МЕМАЎ



**Згадзіцеся, значна прасцей выказаць свае думкі, спасылаючыся на чарговы мэйн-стрымаўскі комікс. Мабыць, моладзь у чарговы раз гоніцца за своеасаблівай модай і баіцца не дагнаць яе... У наш час словы з папулярных інтэрнэт-коміксаў становяцца для яе своеасаблівай «азбукай Морзэ». Наўрад ці дарослы чалавек зразумее, чаму ўсе пагалоўна кажуць: «Не, не чуў», «Дзетка, ты космас», «Толькі імправізацыя, толькі хардкор»...**

Але часам такі падыход перашкаджае маладзёнам выразіць сваю думку ў грамадстве, іх могуць няправільна зразумець. Мама наўрад ці зразумее, калі заявіш ёй, што ты «forever alone», а настаўніку фізікі не скажаш: «У нас тут свая атмасфера»... Што такое коміксы і чаму яны прыцягваюць увагу моладзі?

**Комікс** (ад англ. comic — смешны) — гісторыя ў малюнках, якая ўвасабляе сабе рысы літаратуры і выяўленчага мастацтва. Коміксы з'явіліся яшчэ ў XVI ст. у Барселоне. Дарэчы, менавіта з-за комікса «Жоўты малыш» Херста і Пуліцэра з'явіўся тэрмін «жоўтая прэса»...

Першапачаткова яны насілі строга рэлігійны характар: пераказвалі жыції святых. Але з цягам часу інтэрнэт-коміксы становяцца менш духоўнымі і больш вульгарнымі. Цяпер яны носяць толькі свецкі характар. Мастацкі і літаратурны сэнс таксама пагоршыўся. Калі гаворка ідзе пра інтэрнэт-коміксы, нельга не згадаць слова **«мем»** — «адзінку перадачы культурнай інфармацыі, якая распаўсюджваецца ад аднаго чалавека да іншага праз імітацыю, навучанне і інш.». Самымі папулярнымі мемамі сярод інтэрнэт-коміксаў сталі вось такія:



*Як так? Хіба такое магчыма?*



*«Forever alone» — заўсёды адзін*



*«Trollface» — злараднасць*




























**Усе фразы з інтэрнэт-коміксаў (напрыклад, «forever alone») з моманту свайго нараджэння хутка разлятаюцца па свеце. Моладзь успрымае гэта як сродак заявіць пра сябе ў кампаніі і грамадстве, нібыта кажучы: «Гэй, я таксама ў тэме!»... Але час не стаіць на месцы, усё хутка мяняецца. І ўзнікае пытанне: «Дык ці патрэбныя наогул гэтыя коміксы і мемы, якія апанавалі інтэрнэт?» Вось што пра гэта думаюць самі маладыя.**



**Уладзіслаў СІВІЦКІ, студэнт факультэта прыкладной матэматыкі БДУ:**

— Спачатку коміксы былі спробамі людзей падзяліцца смешнымі сітуацыямі з жыцця. З часам яны ператварыліся ў спаборніцтва зрабіць яшчэ «прышпільней», калі адзін і той жа малюнак па-рознаму інтэрпрэтаваўся сотні, тысячы разоў, пакуль людзям не пачало гэта дакучаць. Мяне здзіўляе глупства людзей.



**Аляксандр СМЯХОВІЧ, вучань гімназіі № 18 г. Мінска:**

— Інтэрнэт-коміксы — дзіцячая забава. Не лічу іх чымсьці патрэбным і сур'ёзным. Вось калі мне было гадоў 12, захапляўся імі :). Уся мода на гэтыя выразы і коміксы мяняецца ледзь не кожны дзень. Тыповы прыклад масавай культуры.



**Міраслаў КАЗАК, студэнт факультэта інфармацыйных тэхналогій і кіравання БДУіР:**

— Скажу проста: часам усміхаюся чарговаму коміксу, але мая душа адданая «Клубу вясёлых і знаходлівых», і я не захапляюся гэтай дзіцячай забавай. Больш за тое, часам мяне пачынае раздражняць, што ўсе людзі вакол размаўляюць фразамі з «кантактаўскіх» мемаў. Іх колькасць зашкальвае, што сведчыць аб недальнабачнасці людзей. Прынамсі, я так лічу.



**Вікторыя СМІРНОВА, ліцэй № 2 г. Мінска, фізмат:**

— У мяне няма часу і асаблівага жадання на чытанне інтэрнэт-коміксаў. Усе выкарыстоўваюць фразы з іх, што прыводзіць да адсутнасці чагосьці індывідуальнага ў мове кожнага. Але, з іншага боку, часам гэта забаўна і ўздымае настрой.



**Лізавета ТАРАН, ліцэй БДУ, філолаг:**

— Коміксы, па-мойму, даволі карысная справа. У іх ані кроплі мастацтва, затое сэнс — гумарыстычны альбо «сур'ёзны». Зрэшты, і там, і там ёсць свае плюсы і мінусы. Але самыя мае любімыя — тыя, дзе прысутнічае сінтэз таго і другога, найчасцей самаіронія, тыпізацыя. Коміксы нават дапамагаюць зразумець іншых і адчуць, што ты не адзін такі.

Такім чынам, усе ўжо «сытыя па горла» гэтымі бессэнсоўнымі інтэрнэтаўскімі коміксамі і фразамі з іх? А гэта значыць, што яны патроху пачынаюць адыходзіць у нябыт? Ці можна іх выкарыстоўваць рацыянальна? Аказваецца, можна.

Узяць хоць бы крытэрыі ацэньвання, калі 10 азначае «цудоўна», а 2 — «нездавальняюча»? Нядаўна мая аднакласніца, якая пажадала застацца ананімам, прапанавала наступную класіфікацыю адзнак, выкарыстоўваючы папулярныя фразы з усім дакучлівых коміксаў *(гл. вышэй)*.

**10 — Not bad (Нядрэнна),**
**9 — so close (Та-а-а-ак блізка),**
**8 — Што ты сказаў?**
**7 — poker face (Каменны твар),**
**6 — lo-o-o-o-ol (Смешна),**
**5 — facepalm (Далонь — твар),**
**4 — Okay,**
**3 — PFF! (Мне ўсё роўна)**
**2 — FU-U-U-U-U!!!**
**1 — Challenge accepted (Выклік прыняты!)**

Але ніхто і не кажа пра тое, што трэба забраць жыццё ў інтэрнэт-коміксаў і хлеб у іх стваральнікаў. Ніколі! Ды і, шчыра кажучы, як размаўляць і што чытаць у інтэрнэце — асабістая справа кожнага.

**Ульяна БУДЗІК.**

*Дарэчы*

## СУПЕР-ПУПЕР! МАМАЙ КЛЯНУСЯ...

**Магчыма, зараз у гэта цяжка паверыць, але ж быў час — даінтэрнэтаўскі, дамабільны... Не было тады ні смайлікаў, ні мемаў. А эмоцыі былі, і іх трэба было неяк выказваць — на школьных уроках і студэнцкіх парах, у вольны час.**

Калі гаварыць пра графічны бок пытання, рабілася гэты досыць проста — звычайнай шарыкавай ручкай (зрэдку алоўкам) на простым аркушы паперы ў «клетачку» з вучнёўскага або студэнцкага сшытка. Наколькі прыгадваю, тэмы такіх малюнкаў былі пераважна ў стылі «фэнтэзі»: нейкія міжгалактычныя істоты, цмокі, касмічныя вяры, кібаргі. Зрэдку гэта магла быць нейкая ваенная тэхніка — самалёт, верталёт, танк. Прысутнічалі дзявочыя вобразы, таксама пераважна вояўнічыя: у даспехах, з мячамі... Намаляваць такое мог далёка не кожны, у аўтараў жа нярэдка збіралася падборка ці нават міні-альбом такіх прац. Кожная з іх прамалёўвалася вельмі старанна цягам, напрыклад, цэлай пары. Чарніла, як кажуць, не шкадавалі. Былі і сяброўскія шаржы, нейкія імгненныя замалёўкі. Але па большасці тэма малюнка адлюстроўвала, як мне падаецца, толькі аднаму аўтару вядомыя памкненні і асацыяцыі.

Вербальны спосаб данесці да навакольных сваю пазіцыю быў даступны ўсім. Што цікава, мода на тыя ці іншыя словы пастаянна мянялася. Напрыклад, пра абяцанні, сцвярджэнні. Адзін час усе гаварылі «Жалезна» (у сэнсе — а як жа, абавязкова, без праблем, абяцаю). Потым пры кожным зручным выпадку сталі вымаўляць «Сто пудоў!» або «Стапудова!» («Пойдзеш сёння на танцы?» — «Сто пудоў!») Сэнс той жа, што і ў папярэднім выпадку, але словы іншыя. У дзяцінстве, памятаецца, яму адпавядалі кароткія фразы «Мамай клянуся!» (а каб канчаткова пераканаць суразмоўцу — «Клянуся сэрцам маці!») і «Зуб даю!» (тут яшчэ і яўны выклік, схаваная пагроза).

Словы, якія перадавалі станоўчыя эмоцыі (здзіўленне, захапленне, ухваленне), таксама часта змяняліся (па меры сталення, хаця градацыя, пагадзіцеся, даволі ўмоўная): ад дзіцячых «Фантастыка!», «Супер-пупер!» да падлеткавых «Супер!», «Клёва!», «Прышпільна»... Ужо ў студэнцкія гады ім на змену прыйшло слова «Нішцяк!» Маўляў, усё добра, па-даросламу. Больш мякка ў творчай кампаніі гучала слова «Файна» (добра, прыстойна, прыгожа). Негатыўныя эмоцыі (раздражненне, крыўду, расчараванне, непрыемнае здзіўленне) выказвалі напачатку словам «Жудасць», а потым «Бляха!». «Моц перадачы» канкрэтных пачуццяў рэгулявалася сілай і працягласцю голасу і адпаведнай мімікай. Апошнім часам на змену больш мяккай «Блясе» пачало прыходзіць грубаватае слова «Трэш», але ў гэтым выпадку мне бачыцца прамы ўплыў інтэрнэту.

А вось фраза з тых жа студэнцкіх часоў "Я цягнуся!" магла адначасова перадаваць як захапленне, ухваленне, так і, у залежнасці ад сітуацыі, здзіўленне з пэўным негатыўным падтэкстам, магчыма, асуджэннем. Напрыклад, «Я цягнуся, што вы тут навытваралі».

Прааналізаваўшы збольшага тагачасныя і цяперашнія «модныя словы», зразумеў, што яны сапраўды дазваляюць выказаць найперш эмоцыі. Прыгадаліся ўсяго некалькі, якія азначалі нешта іншае. Напрыклад, адзін час увайшло ў моду вітацца словам «хай!». А яшчэ раней у творчай моладзі было модным арганізоўваць ці наведваць «сейшны» — не проста вечарыны, тусоўкі, дзе можна было, між іншым, папіць піва, але, найперш, абмяркоўваць музыку, вершаваныя радкі, папулярную кнігу ці прадставіць на ўсеагульны суд уласную творчасць.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

*Ведай нашых!*

## ПУЦЁЎКА Ў ФІНАЛ — У ПРАГРАМІСТАЎ З БДУ

**Каманда студэнтаў БДУ (дарэчы, адзіная з Беларусі) здолела прабіцца ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні. Пяцікурснікі факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ Раман Удавічэнка, Андрэй Малевіч і Сяргей Жгіроўскі паспяхова выступілі ў паўфінальных спаборніцтвах Паўночна-Усходняга Еўрапейскага рэгіёна, якія праходзілі адначасова ў Санкт-Пецярбургу, Барнауле, Тбілісі і Ташкенце. Нашым студэнтам удалося рашыць 10 задач з 12-ці прапанаваных і заваяваць пуцёўку ў фінал.**

Усяго ў паўфінале ўдзельнічалі 229 каманд з Расіі, Беларусі, Латвіі, Літвы, Эстоніі, Арменіі, Азербайджана, Грузіі, Казахстана, Узбекістана, Таджыкістана і Туркменіі. Беларусь у паўфінале прадстаўлялі 9 каманд: 4 каманды з БДУ, 2 каманды з БДУІР і па адной — з Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта і Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

А абсалютным пераможцам спаборніцтваў стала каманда Санкт-Пецярбургскага нацыянальнага даследчага ўніверсітэта інфармацыйных тэхналогій, механікі і оптыкі. Менавіта ў складзе гэтай каманды выступаў і беларус Генадзь Караткевіч — неаднаразовы абсалютны чэмпіён міжнароднай алімпіяды па інфарматыцы сярод школьнікаў. Зараз ён з'яўляецца першакурснікам Санкт-Пецярбургскай ВНУ, таму, адпаведна, і выступае не пад «беларускім сцягам». Дзеля справядлівасці трэба дадаць, што ў адной камандзе з Генам Караткевічам выступалі два дзейныя чэмпіёны свету 2012 года. Такім чынам, атрымалася фактычна непераможнае трыа...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Гульні XXI стагоддзя

# ЭКСТРЫМ ЗА ГРОШЫ:

## СЁННЯ МОЖНА КУПІЦЬ НАВАТ ПАДАРОЖЖА НА ТАНКУ

**Місія:** *патраціць грошы (многа) на адрэналін.*
**Зона:** *Беларусь.*
**Дадатковая ўмова:** *«пасрэдныя» фізічныя даныя.*

Я невыпадкова прапісала ў «параметрах», што патраціць трэба многа грошай. На жаль, экстрэмальныя задавальненні рэдка бываюць таннымі. Больш за тое, у нашай краіне такія паслугі могуць каштаваць нават даражэй, чым за яе межамі. Але добра ўжо тое, што сёння аматарам моцных уражанняў ёсць дзе «спусціць пару» і, адпаведна, патраціць грошы, не выязджаючы за мяжу. Прычым з кожным годам такіх прапаноў становіцца ўсё больш.

Зараз «экстрым» прадаецца ў спартыўна-забаўляльных комплексах, клубах, на базах, дзе трэніруюцца спартсмены, у турагенцтвах і аграсядзібах. Многія сталыя аматары экстрэмальнага адпачынку сваё захапленне выкарыстоўваюць у тым ліку і для зараблення грошай — адкрываюць пункты пракату, працуюць інструктарамі, арганізоўваюць падарожжы. Адрэналін магчымы і напракат, напрыклад, калі вы арандуеце квадрацыкл, спідвей, каяк ці водны матацыкл. Урэшце, адрэналін можна атрымаць у падарунак (альбо, наадварот, некаму купіць). Сёння існуюць кампаніі, якія гандлююць «падарункамі з уражаннямі»; трэба толькі вызначыцца, якая прыгода падыдзе вам альбо таму, каму вы хочаце зрабіць прыемны сюрпрыз.

### ПАСТРАЛЯЕМ?

Сёння да звычайныхціраў (напрыклад, як у сталічным парку Чалюскінцаў, дзе за адзін стрэл вы плаціце тысячу рублёў) дабавіліся і «наварочаныя». Калі вы гатовы раскашэліцца (пусціць на такі занятак 300 і болей тысяч рублёў), то страляць будзеце не па папяровых мішэнях, кеглях, бляхах ці пагнутых фігурках, а па талерках. Дарэчы, тыя, хто ніколі не трымаў зброю ў руках, могуць атрымліваць кансультацыі (урокі) па стральбе ў вопытных інструктараў.

Страляць можна не толькі з пнеўматычнай вінтоўкі. Аматарам такога адпачынку прапануецца і стральба з сапраўднай (халастой) зброі часоў Вялікай Айчыннай вайны: аўтаматаў ППШ, штурмавой вінтоўкі, маўзера, кулямёта «Максім».

А можа, вам больш падабаецца стральба з лука і арбалета?..

Але што такое стральба па мішэнях у параўнанні з цэлымі гульнямі ў вайну, тым больш, калі такім чынам вы плануеце правесці адпачынак цэлай кампаніяй. «Ваярам» могуць прапанаваць спецыяльны сцэнар альбо распрацаваць яго з улікам пажаданняў кліента. «Ваенныя дзеянні» могуць разварочвацца як у будынку, так і ў лесе. Нават ствараюцца пэўныя ўмовы для імітацыі бою: перашкоды, макеты будынкаў і транспарту, акопы. Прычым можна як выбрацца на прапанаваную гульнявую пляцоўку, так і правесці гульню на сваёй тэрыторыі.






У час адной з такіх ваенна-спартыўных гульняў — страйкболу — аматары актыўнага адпачынку могуць выкарыстоўваць «агнястрэльную зброю» розных краін свету (дакладней, яе копіі з пластыку і металу), а ў якасці патронаў выкарыстоўваюцца пластыкавыя шарыкі. Для тых, хто хоча пагуляць у сучасную «вайнушку», ёсць і іншыя варыянты — пейнтбол (стральба вядзецца шарыкамі з фарбамі) і лазертаг (выкарыстоўваецца зброя на лазернай аснове).

### ПРАКАЦІМСЯ?

Сёння напракат можна ўзяць не толькі ролікавыя канькі ці горныя веласіпеды, але і электравеласіпеды, сігвеі (электрасамакаты), скутары, квадрацыклы і трыцыклы (трохколавыя матацыклы). Прычым транспартны сродак падабраць у залежнасці ад таго, якое ўражанне хочаце атрымаць. Адна справа — проста пракаціцца па парку, не набіраючы вялікай хуткасці, іншая — экстрэмальныя гонкі па бездарожжы. Між іншым, калі вы бераце напракат квадрацыкл, можаце як пракаціцца па нейкай пэўнай мясцовасці, так і замовіць арганізацыю экстрэмальных гонак з пэўнымі перашкодамі, у тым ліку і гразевымі трасамі, ямамі з вадой.

Зараз за грошы можна паспрабаваць сябе нават у якасці пілота гоначнага баліда, пры гэтым не рызыкуючы, як сапраўдны гоншчык, таму што лавіць адрэналін вы будзеце ў картынг-цэнтры. Прычым у некаторых з іх паганяць на хуткасці можна і ў начны час. Так нават танней.

Ды што там, сёння вам могуць прапанаваць (вядома — за грошы) нават пакатацца на бронетранспарцёры ці танку.

Калі вас не задавальняе наземны транспарт, можна выбраць іншы. Напрыклад, заказаць пракат яхты і катара. А можа, вас задаволіць катанне на водных лыжах ці вэйкбордзінг (для катання па вадзе выкарыстоўваецца спецыяльная дошка).

Можна сабрацца і ў працяглыя водныя падарожжы. Сплавы на платах і каяках арганізуюцца як просценькія, куды можна выправіцца нават з маленькімі дзецьмі, так і больш складаныя, на дзень альбо на некалькі.

А для тых, хто марыць пра нябёсы, ладзяцца экскурсіі на самалёце і верталёце, аэраплане, паветраным шары. Для экстрэмалаў магчымыя і скачкі з парашутам, і курсы пілотаў паветранага судна.

### ПАВУЧЫМСЯ?

Між іншым, сёння можна атрымаць майстар-класы па экстрыме. Можна вучыцца рабіць трукі на батуце, экстрэмальнаму ваджэнню, коннай яздзе, скалалазанні і слэклайну (хадзьбе па канаце).

Сёння ладзяцца і вяровачныя курсы, прапануюцца экстрэмальныя падарожжы па распрацаваным сцэнары, удзельнікам якіх трэба навучыцца арыентавацца на мясцовасці.

Сярод забаў XXI стагоддзя можна ўзгадаць яшчэ зорбінг — спуск чалавека з гары ў круглым празрыстым шары з поліўрэтану. Магчыма, адчуванне, быццам вас пракруцілі ў пральнай машыне — не тое, што вам трэба. Тады, можа, вам больш даспадобы бегаць трохмятровымі крокамі і скакаць у вышыню на некалькі метраў? Гэта цалкам магчыма дзякуючы джамперам — спецыяльным прыстасаванням, якія мацуюцца на нагах.

А можа, вы хочаце стаць удзельнікам рэальнага квэста, калі трэба будзе разабрацца з пэўнымі (вядома, загадзя запланаванымі) інтрыгамі, вырашыць не адну галаваломку?

Дарэчы, сёння экстрым падаецца не толькі як актыўны адпачынак, «падарунак з уражаннямі», але і як пэўны сродак для згуртавання працоўнага калектыву. Прыгодніцкія туры, квэсты, вяровачныя курсы, камандныя эстафеты альбо нейкія экстрэмальныя выпрабаванні актыўна выкарыстоўваюцца для тымбілдынгу (фарміравання каманды). Многія кампаніі сёння гатовы плаціць за такія карпаратыўныя выезды не толькі для таго, каб заахвоціць сваіх супрацоўнікаў, але і праверыць, хто на што здольны, выявіць лідараў і выпрацаваць стратэгію развіцця калектыву. А хіба вы не будзеце больш давяраць калегам, з якімі ўдзельнічалі ў рыцарскім турніры, гонках на квадрацыклах, палёце на паветраным шары альбо здзейснілі разам масавы скачок з парашутам?

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**
**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**



### ВЫДАТКІ

Назаву толькі некаторыя кошты (на адну і тую ж паслугу, у залежнасці ад таго, дзе вы яе замаўляеце, могуць быць розныя выдаткі, акрамя таго, за пэўную суму некаторымі паслугамі можа скарыстацца як адзін чалавек, так і пара ці цэлая кампанія).

**стральба ў ціры** (1 стрэл) — ад 1 тысячы;
**зорб** (спуск) — 40 тысяч;
**картынг** (10 хвілін) — 120 тысяч;
**пейнтбол і страйкбол** (некалькі гадзін) — 120-130 тысяч рублёў з чалавека;
**водныя лыжы і вэйкбордынг** (1 гадзіна) — 95 і 125 тысяч рублёў;
**арэнда катара** (1 гадзіна) — 600 тыс. рублёў;
**катанне на танку** — 3 млн, на БТР — каля 1 млн рублёў;
**палёт на паветраным шары** (1 гадзіна) — больш як 2 млн рублёў;
**пракат яхты** (1 гадзіна на некалькі чалавек) — 500-700 тысяч рублёў;
**скачок з парашутам з інструктарам** — 1,5 мільёна рублёў;
**экскурсіі на самалёце ці верталёце** — 2-9 мільёнаў рублёў;
**катанне на конях** (45 хвілін з інструктарам) — 100 тысяч рублёў.

# ВЯЛІКАЯ СПРАВА МАЛЕНЬКІХ ЛЮДЗЕЙ

**(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар. «ЧЗ».)**

Самае галоўнае дасягненне валанцёраў і кіраўніцтва 137-й школы — выданне кнігі «Малалетнія закладнікі вайны 1941—1945 гг.: жывыя сведчанні Беларусі», якая выйшла сёлета і стала вынікам больш чым пяцігадовай працы. У аснову кнігі ляглі ўспаміны малалетніх ахвяр фашызму. І ў гэтым вялікая заслуга школьнікаў, якія не проста, для «адчэпкі», слухалі аповеды старых, а занатоўвалі ў сшытак ці запісвалі на дыктафон самае важнае — летапіс людскіх лёсаў.

Вось некалькі з іх...

**Зяленіна (Заўгародняя) Ідэя Міхайлаўна** *(нарадз. 8.04.1925, г. Славянск (Украіна).*

*«Я трапіла ў Заходнюю Германію, у г. Алцену. Нас было некалькі чалавек, і ўсе былі з розных гарадоў і вёсак Украіны. Нас размясцілі ў цёмным бараку. Мы спалі на нарах з саломай у два ярусы. Усіх прызначылі працаваць на фабрыцы. Мы працавалі па 12 гадзін на дзень; у 4.30 — пад'ём, у 5.30 — выезд на працу. Нам выдалі камбінезоны, курткі і драўляныя чаравікі. Пад канвоем паліцэйскага і перакладчыка ў калоне па 4 чалавекі мы ішлі на працу. Яна была цяжкая, ля станкоў, трэба было пракачваць металічныя стужкі даўжынёй 2,5 метра і шырынёй 10—15 сантыметраў... За брак (а правяралі майстры-немцы) нас жорстка каралі дубінкамі.*

*Харчаванне было бедным: раніцай — кубак эрзац-кавы з лустачкай эрзац-хлеба, а абед складаўся з баланды, у якой было крыху бручкі, кальрабі, бульбы, а вечарам — зноў горкая кава з лустачкай хлеба. Ад такой ежы многія хварэлі, асабліва хлопцы. Нам давалі трохі грошай, але мы нічога не маглі на іх купіць, паколькі ў немцаў была картачная сістэма. Мы былі рабамі ў немцаў, і яны так і ставіліся да нас. Надвор'е было сырым, а вопратка на нас — занадта лёгкай. Хварэлі і паміралі там многія».*

**Тразкова (Падольская) Галіна Васільеўна** *(нарадз. 10.06.1940, в. Чахец Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці).*

*«У вёсцы Пескі быў створаны канцлагер. Немцы сагналі туды яўрэяў, якіх неўзабаве расстралялі. 7 верасня 1942 года фашысты сагналі ў гэты лагер усіх жонак ваеннаслужачых з дзецьмі. 16 сакавіка 1944 года ўсіх маці павезлі ў Германію, і дзеці засталіся адны. Фашысты ператварылі іх у донараў, бралі кроў для сваіх параненых і праводзілі страшэнныя эксперыменты.*

*Побач з канцлагерам за калючым дротам была вялізная варонка ад узарванай бомбы. Сюды фашысты выкідвалі паміраючых дзяцей, якіх ужо нельга было выкарыстоўваць для збору крыві. Жыхары казалі, што ў яме дзеці варушыліся, як чарвякі. Калі яма была запоўнена, яе прысыпалі зямлёй, і наверсе паставілі падбіты танк. У адным кінафільме я бачыла эпізод, калі немка з сабакам у суправаджэнні начальства раздавала ў канцлагеры дзецям цукеркі і пыталася, як ім жывецца. А яны працягвалі ручкі з закасанымі рукавамі і казалі, што жывуць добра і яшчэ могуць здаваць кроў. Гэта — эпізод з нашага лагера. Гэта наша дзяцінства».*

*...Кожная гісторыя ў кнізе — пра зламаны лёс, шрам на ўсё жыццё, невылечную рану. У той час як немцы лічаць, што загладзілі сваю віну, беларускія школьнікі спрабуюць хоць крышачку суцішыць боль, які не будзе даваць спакою яшчэ многім пакаленням.*

**Вераніка КАНЮТА.**

SEX-БАЛЯСЫ

# «КАМАСУТРА» КАМП'ЮТАРНАЙ МЫШКІ

**...У старажытнасці, калі жанчыны яшчэ не ведалі слова «аргазм», яны адчувалі жаданне пляскаць у ладкі, вадзіць карагод, а таксама бачылі дзіва-дзіўнае і цуд цудоўны. Ну, дык тое, па-першае, пра даўніну, па-другое, гэта ўвогуле — анекдот. Чаго не скажаш пра наша сённяшняе жыццё... Тут табе не толькі тлумачэнне слова выдадуць, але яшчэ і... пакажуць усё. Прычым часта нават без тваёй на тое згоды. Гаворка, вядома, пра інтэрнэт. І тэма нашых сённяшніх «Балясаў» у згаданым кантэксце — эротыка і парнаграфія.**

У кожнага з пакаленняў свой шлях да знаёмства з імі. Раскажу пра сваіх равеснікаў і іх досвед. Цяпер аналізуеш яго і разумееш (вядома, з пазіцый сённяшняга дня), што, хаця забаронены (хутчэй — недаступны) плод — салодкі, той час, па вялікім рахунку, быў вельмі цнатлівым. А тое, што мы бачылі, мела, як ні дзіўна прагучыць, пэўную адукацыйную функцыю (трэба ж памятаць тыя часы: у СССР сэксу не было!).

...Ужо некалькі «дасведчанай» малечай мы зацікавіліся машынапісным стосам паперы з нейкімі малюнкамі. Гэты незвычайны «рукапіс» старанна ад нас хавалі старэйшы стрыечны брат з жонкай, запіраючыся з ім у вялікім пакоі. Але ж хто хоча — той знаходзіць... Потым я зразумеў, што гэта была перадрукоўка звычайнай кніжкі па псіхалогіі сямейнага жыцця. Цяпер гэтым нікога не здзівіш, а тады машыністка, запраўляючы адразу ці не па пяць капірак запар, каб зрабіць пабольш экзэмпляраў, старана перадрукоўвала тэкст. І потым гэты «рукапіс» давалі пачытаць — на дзень-другі.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Потым былі чорна-белыя карты на фотапаперы. Знятыя-перазнятыя. Цяпер іх нават эратычнымі язык не паварочваецца назваць, а тады... У тыя гады многія захапляліся фатаграфіяй, таму вырабіць асабісты камплект (каб у сапраўднага пацана, ды не было?) не з'яўлялася праблемай. Маю калоду неяк выпадкова знайшла маці, калі я ўжо і забыўся пра яе. Памятаю, што было вельмі няёмка... Адпаведныя часопісы былі рэдкасцю. Траплялі ў рукі неяк выпадкова і ненадоўга. Калі была магчымасць, іх пераздымалі на фотастужку.

Адкрыццём станавіліся некаторыя кавалкі тэкстаў з мастацкай літаратуры. Напрыклад, «Пётр Першы» Аляксея Талстога... Пра тое, якія старонкі трэба найперш глядзець у падручніку па анатоміі за 8 клас, ведалі нават шасцікласнікі. Шчасціла таму, у каго былі старэйшыя брат ці сястра...

Памятаю літаральна віск настаўніцы наступным днём пасля калектыўнага прагляду ці не ўсёй школай у кінатэатры знакамітай «Маленькай Веры»: навошта гэты эпізод, чаму яго не выразалі, няўжо стужка пацярпела б ад таго? Зараз зноў жа прыгадваеш і думаеш: было з-за чаго так нервавацца. Хаця тагачасных падлеткаў уразіла. Магчыма, жанчыне было папросту няёмка ад таго, што побач былі вучні? Ды сын-школьнік недзе, напэўна, сядзеў у цемры кіназалы...

**Пра тое, якія старонкі трэба найперш глядзець у падручніку па анатоміі за 8 клас, ведалі нават шасцікласнікі. Шчасціла таму, у каго былі старэйшыя брат ці сястра...**

А потым надышоў час відэа. Пра тое, як збіраліся недзе ў кагосьці дома для прагляду касеты, доўга гаварыць не буду: многія, напэўна, памятаюць. Прыгадваеце, у нешматлікіх шчаслівіўцаў быў такі груваcткі савецкі відэамагнітафон «ВМ-12»? Націскаеш на кнопку, касетапрыёмнік з адмысловым скрыгатам падымаецца ўверх і падаецца наперад. І касеты — пісаныя-перапісаныя, зашмальцаваныя звыш меры, практычна без гуку. Хаця прычым тут гук? (Зноў жа анекдот. «У салоне пракату. «Дайце мне вось гэтую касету». «Калі ласка, толькі яна на нямецкай мове, без перакладу». «Нічога, я зразумею».) А запісвалі іх зверху па мульціках, баевіках. Упакоўка адна, а змесціва — іншае. Памятаеце жарт у тэму з «Клуба вясёлых і знаходлівых»? «Ну што, паглядзеў наша вяселле? Ты ж касету браў!» — «Дык там адна парнаграфія!» — «Дык трэба было ўперад пераматаць, дзе ЗАГС, кветкі, пацалункі...» Ну пагадзіцеся, усё — дастаткова цнатліва. Памятаю, адзін вядомы сэксолаг неяк мне сказаў (спакойна, я на інтэрв'ю быў!): калі сужэнцы, кладучыся спаць, паглядзяць такі фільм і ўсё ў іх пасля будзе добра — дык і цудоўна!

...І тут прыйшоў інтэрнэт... Выйшла што? Звернемся да яшчэ аднаго жарту з «Клуба вясёлых і знаходлівых» (спяваецца на манер герояў з «Брэменскіх музыкантаў»): «Усе дарогі, як не выбірай ты, усё адно вядуць на порнасайты». Тое, што раней здабывалася мэтанакіравана і з цяжкасцю, цяпер само прыйшло да кожнага карыстальніка інтэрнэту — праз просты «клік» камп'ютарнай мышкай. Вядома, я некалькі ўтрырую і перабольшваю. Але толькі трохі. Не так, як у тым старым анекдоце: «У мяне скарга: з акна відаць жаночае аддзяленне ў лазні!» — «Якім чынам??? Пад вашым жа акном дрэва, і лазня на адлегласці, ды і акно на дзве траціны зафарбаванае?» — «А вы на шафу залезьце!»

Памятаю выпадак на працы, калі па маніторы ў работніцы пайшоў фільм вядомага зместу. Кабінет людны, заходзяць іншыя супрацоўнікі, а яна нічога зрабіць не можа... Пакуль «кіно» не скончылася, нічога зрабіць не маглі нават з дапамогай камп'ютаршчыкаў. Упэўнены, што дарослы чалавек зрабіў так не наўмысна. Проста зараз, калі, да прыкладу, звяртаешся да пошукавай сістэмы, трэба памятаць: у твайго простага на першы погляд запыту можа быць зусім іншы, «патаемны сэнс», пра які ты нават не падумаў. Ці можна папросту «клікнуць» не туды. Вось прыклад: школьніцы для выканання нейкага пазакласнага задання патрэбна была ілюстрацыя з дзвюма дзяўчынкамі, якія трымаюцца за рукі. Маці потым казала: маўляў, добра, што села побач — ці не дзве гадзіны шукала цалкам прыстойны малюнак, бо на запыт такое выдавалася... Вы пагаварыце — не для друку — з любой настаўніцай, якая адпрацавала ў школе хаця б некалькі гадоў: такога наслухаецеся пра сучасную мольдзь і іх паводзіны, норавы... Думаецца, гэта вынік у тым ліку і ўплыву інтэрнэту, той самай «камасутры» камп'ютарнай мышкі. Сам інтэрнэт, вядома, не вінаваты. Ён толькі сучасны сродак, без якога ўжо не абысціся. Галоўнае, як і для чаго ім карыстацца. І ўсё ж мне думаецца, што наша дзяцінства, маладосць былі больш цікавымі. Не такімі, магчыма, насычанымі, але ж бяспечнымі.

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

Свая каляіна

# ТВОРЧАСЦЬ — ГЭТА ЯШЧЭ І ВЫГАДНА

**Сёння падлеткам складана знайсці крыніцу ўласнага грашовага прыбытку. Калі і можна ўладкавацца на працу, дык пераважна ўлетку, калі школа не забірае большую частку вольнага часу. Але на тое яна і маладосць, каб прыстасоўвацца. Сучасныя падлеткі настолькі вынаходлівыя, што ім прыдумаць, як зарабіць уласны рубель — невялікая праблема. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца творчасць Алесі БАЛАЦЬКО.**



Дзяўчына ў свае 15 гадоў займаецца любімай справай, прыносіць людзям радасць, эстэтычнае задавальненне, атрымлівае асалоду ад сваёй творчасці і... зарабляе грошы. Сутнасць яе працы заключаецца ў стварэнні адмысловых паштовак у стылі scrapbooking (англ. scrapbooking, ад англ. scrapbook: scrap — выразка, book — кніга, літаральна «кніга з выразак»). Гэты від дэкаратыўна —прыкладнога мастацтва ў поўнай меры можна назваць спосабам захавання асабістай ці сямейнай гісторыі з дапамогай фотаздымкаў, выразак з газет, малюнкаў і іншых памятных дробязяў, якімі ўпрыгожваюць фотаальбомы. Варта заўважыць, што скрапбукінг — гэта не толькі дэкор фотаальбомаў. Некаторыя майстры працуюць над паштоўкамі, і потым яшчэ тэлефанавалі і рабілі дадатковыя заказы (*смяецца*).

***— Што ўяўляе сабой працэс стварэння паштоўкі?***

— На дэкор аднаго асобніка ў мяне ідзе прыкладна паўтары гадзіны. Матэрыял для працы набываю ў крамах. Гэта розныя пацеркі, бліскаўкі, стужкі і іншае, а таксама спецыяльны кардон. Памер стандартнай паштоўкі — 15x15 см, калі выконваю нейкі пэўны заказ, згінаю аркуш фармату А4 папалам.

***— Як зразумець «пэўны заказ»? Якім чынам людзі замаўляюць у цябе вырабы?***

— Гэта калі мяне просяць зрабіць тэматычную паштоўку. Напрыклад, выкарыстаць фотаздымак пэўнага чалавека, яго імя, любімыя колеры, даты. Ёсць і шмат іншых патрабаванняў. А заказы прымаю праз сеціва ці тэлефон.














***— З чаго пачалося тваё захапленне?***

— Скрапбукінгам займалася матуля майго аднакласніка. Я доўга не давала ёй праходу, прасіла навучыць мяне. Урэшце яна згадзілася. І вось вынік (*усміхаецца*).

***— Раскажы больш падрабязна пра свой занятак?***

— Ствараю паштоўкі пераважна да дня народзінаў, Новага года, але гэтым не абмяжоўваюся. Аднойчы ў мяне купілі 12 асобнікаў, прызначаных да свята жанчын. На той момант у маёй кватэры быў рамонт, і рабочыя, убачыўшы маю творчасць, з радасцю раскупілі ўсё

***— Калі заказаць у цябе паштоўку, колькі гэта будзе каштаваць? І ці будзе ў цябе з гэтага які-небудзь прыбытак?***

— Раней стандартны асобнік каштаваў 15 тысяч рублёў, асобнік фармату А4 — 20 тысяч. Цяпер жа цэны на матэрыялы растуць, і кошт крыху павялічыўся. Стала адпаведна 20 і 25 тысяч. Прыбытак, безумоўна, ёсць. З кожнай паштоўкі — прыкладна 5 тысяч. Я лічу, гэта немалы заробак для майго ўзросту.

***— Ці думаеш эксперыментаваць у сваёй дзейнасці і надалей?***

— Ужо эксперыментую! Нядаўна стварыла нешта не падобнае на ўсё астатняе — а менавіта маленькую папяровую камоду, упрыгожаную рознымі стужачкамі, малюнкамі і пацеркамі. Твор свой упадабала і вырашыла пакінуць сабе як крыніцу натхнення. А наогул, думаю пра дэкор фотаальбомаў, сцен і асабліва дзвярэй...

***— Гэтае захапленне, акрамя матэрыяльнай узнагароды, табе яшчэ нешта дае?***

— (*Задумалася.*) Шчыра кажучы, матэрыяльная ўзнагарода не на першым плане для мяне. Пачуццё ўзнёсласці, якое я перажываю, калі бачу радасныя твары людзей, не перадаць словамі! Бываюць выпадкі, што тыя, для каго заказвалі паштоўкі, тэлефануюць, дзякуюць і просяць зрабіць такую ж прыгажосць ужо для сваіх сяброў. І гэта мяне яшчэ больш натхняе. Калі можаш выклікаць добрыя эмоцыі ў людзей, дык ад гэтага не проста атрымліваеш асалоду, а гэтым жывеш!

...Калі бачыш работы Алесі, іх хочацца не толькі набыць, але і нешта падобнае паспрабаваць зрабіць самой. А ў выніку — атрымаць асалоду ад сваёй працы. І да таго ж — грашовы прыбытак.

**Ірына КРУКОВІЧ, Ліцэй БДУ.**

ЧЫРВОНКА. Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда»; грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».

Галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказны за выпуск — намеснік галоўнага рэдактара Наталля КАРПЕНКА.

Адрас рэдакцыі:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактны тэлефон: 292 44 12.
e-mail: posts@tut.by; info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013,
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 26.520.
Нумар падпісаны ў 19.30 05.12.2012 г.

# АБУДЖЭННЕ ЦЫБУЛЬНЫХ

**Яркія духмяныя цюльпаны, нарцысы, крокусы, ірысы зімой, калі за акном мароз і мяцеліца, — ці гэта не цуд? Такі жывы куток у сваім доме дазволіць забыць пра сумныя і непрыемныя моманты ў жыцці, настроіць на пазітыў.**

Выганкай можна займацца ўсю восень (верасень-лістапад), і тады Каляды або Дзень святога Валянціна (а магчыма, нават 23 лютага і 8 Сакавіка) ператворацца ў сапраўдныя святы кветак.



## Падрыхтоўка

Спачатку мы падрыхтоўваем цыбуліны, вытрымаўшы іх на працягу 1,5-2 месяцаў (у залежнасці ад гатунку, а цеплалюбівым часу спатрэбіцца яшчэ менш) у адкрытых пакетах на балконе, а лепш у халадзільніку ў ніжнім аддзяленні. Пры гэтым трэба быць асцярожным: працуем у гумавых пальчатках, таму што некаторыя цыбульных змяшчаюць таксіны, якія могуць выклікаць раздражненне скуры.

## Усё гэта проста

Для выганкі выкарыстоўваем вазоны з дрэнажнымі адтулінамі і паддонамі да іх, у якія зліваецца вада. У крайнім выпадку, для гэтага можна выкарыстоўваць слоікі з-пад маянэзу або гарчыцы. Глебу, сумесь мы заўсёды купляем у краме, балазе, такі выбар ёсць. Можна выкарыстоўваць і садовы грунт, падрыхтаваны загадзя да маразоў. Змяшчаем у ёмістасць, напалову напоўненую грунтам, цыбуліну, сочачы, каб яна не сядзела шчыльна да сценкі вазона. Зверху засыпаем слоем глебы і злёгку ўшчыльняем. Напрыклад, цыбуліны гіяцынтаў павінны крыху выступаць над паверхняй глебы, а іншыя расліны высаджваем глыбей. Паверхню глебы ўпрыгожваем мохам або слоем колатага гравію.

## Час цвіцення

Пасля пасадкі добра паліваем глебу і трымаем ва ўвільготненым стане пастаянна. Дзён 10-15 ёмістасці ў нас стаяць у цёмным памяшканні, пры тэмпературы +8 -10 градусаў. Гэта дапамагае нарасціць цыбулінам добрую каранёвую сістэму. А вось калі на паверхні з'явяцца расткі 5-10 см, мы пераносім сваіх гадаванцаў у цёплае асветленае месца. Дзесьці праз месяц у нас утвараюцца бутоны. А калі яны афарбуюцца, мы ставім іх у паўцень, каб працягнуць час цвіцення.

**Яўген САЛАНОВІЧ, дачнік са шматгадовым вопытам.**

Крынічка
«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.
Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ, тэл. 287 18 27.
№ 34 (456)

# НАРОДНЫЯ ПРЫКМЕТЫ

✓ Цёплы снежань — да зацяжной зімы і позняй халоднай вясны.

✓ Першы снег у снежні шчыльны, мокры і цяжкі — быць вільготнаму лету, а сухі і лёгкі — быць і лету сухому.

✓ Снежань снежны і халодны — будзе і год урадлівы.

✓ Сапраўднай зімы без трох падзімкаў не бывае.

✓ Пасля вялікага ўраджаю — суровая зіма.

✓ Першы снег за сорак дзён да зімы выпадае.

✓ Калі снег выпадае, а ліст з дрэва не спадае, то зіма будзе лютай.

✓ Першы трывалы снег выпадае ўначы, дзённы снег не ляжыць.

✓ Пры неўраджаі на шышкі елкі, сасны — зіма не бывае суровай.

✓ Вялікія мурашнікі — да суровай і доўгай зімы.



# ЧАМУ Ў ВАЗОНАХ З'ЯВІЎСЯ БЕЛЫ НАЛЁТ?

**Шаноўная рэдакцыя! Дапамажыце знайсці адказ на такое пытанне: што трэба рабіць, каб зямля ў вазонах з кветкамі не пакрывалася шэра-белым налётам? Падрыхлю зямлю ў вазонах — усё добра. Праходзіць 3-5 дзён — зноў налёт шэра-белы. Ніколі раней такога не бачыла, а мне ўжо 72 гады. У сяброўкі спытала — і ў іх такое ж адбываецца.**

**Краснова Ала,** *пасёлак Жарнасекі, Віцебская вобласць.*

Часцей за ўсё такі налёт — гэта солі, якія выступілі на паверхні глебы. Калі грунт занадта цяжкі па саставе ці ў ім занадта шмат пяску, вільгаць цягнецца да паверхні глебы і, выпараючыся з яе, пакідае сляды солі.

Другой прычынай з'яўлення белага налёту можа быць празмернасць угнаенняў у глебе, асабліва калі ў вазон з пакаёвай раслінай дададзена пакупная сумесь для вырошчвання гародніны. Калі пры перасадцы мы змясцілі расліну ў занадта вялікі для яе вазон, то яна не зможа сама засвоіць усю вільгаць, якую атрымлівае. І лішак вільгаці будзе выпарвацца з глебы, падцягваючы да яе паверхні солі. Усе ўгнаенні трэба ўносіць строга па інструкцыі ці нават трошкі менш.

Узнікае белы налёт і пры паліванні раслін жорсткай вадой. Вось чаму



амаль заўсёды можна чуць парады паліваць расліны мяккай вадой, якая адстаялася. Пазбавіцца ад салявых адкладаў можна, зняўшы верхні тонкі слой зямлі з налётам і падсыпаўшы слой новага грунту. Калі ў вазон падсыпаць керамзіт, то ён стане не толькі дэкаратыўным рашэннем, але і будзе ўбіраць залішнюю вільгаць.

Рэкамендуюць прысыпаць зямлю рачным пяском і затым разрыхліць верхні слой глебы. Рыхленне глебы з дадаваннем рачнога пяску спрыяльна для каранёў раслін.

Сухое паветра таксама можа стаць прычынай з'яўлення белага налёту на грунце ў кветкавым вазоне. Сачыць за вільготнасцю паветра — найпершая справа для кветкавода. Сухое паветра дапамагае з'яўленню павуцінавага кляшча, а гэта значна горш за белы налёт.

Яшчэ адной прычынай такога налёту можа быць і цвіль, выкліканая празмерным паліваннем. Трэба падсушыць глебу ў вазоне. Лепшы спосаб барацьбы з грыбковым налётам — перасадзіць расліну ў іншы субстрат, які падыходзіць для гэтага віду. Але, як правіла, добра дапамагае, калі верхні слой глебы засыпаць попелам, тоўчаным вугалем і падсушыць. Затым сабраць яго і замяніць свежым грунтам.. Ёсць рэкамендацыі пасыпаць зямлю парашком карыцы.Каб налёт не з'явіўся зноў, трэба паліваць расліну толькі пасля падсыхання верхняга слоя зямлі ў вазоне.

# ЧЫТАЙЦЕ І... ЧАКАЙЦЕ ПОСПЕХУ

2012 ГОД КНІГІ

## «Чытаймер поспеху» — такі праект, прысвечаны Году кнігі, зрабілі ў Магілёве

**Усё проста: кніга, якую параіць прачытаць вядомы чалавек альбо нават кумір, набывае двайную важкасць у вачах патэнцыйнага чытача. Нездарма на сайтах пра свецкае жыццё здараюцца падборкі фотаздымкаў, дзе селебрыці ўсяго свету злоўлены папарацы за... чытаннем. Якім кнігам яны аддаюць перавагу — гэта заўсёды цікавіць фанатаў вядомых музыкантаў, акцёраў і іншых «зорак».**




Падобную ідэю ўзялі на ўзбраенне супрацоўнікі Цэнтральнай гарадской бібліятэкі імя Карла Маркса ў Магілёве. Яны прапанавалі людзям, вядомым у абласным цэнтры, даць свае рэкамендацыі — на гэты раз, як чытачы чытачам.

Старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік раіць прачытаць кнігу Мікалая Барысенкі «Дняпроўскі рубеж: трагічнае лета 41-га» пра гераічную абарону Магілёва. Патрыятычны выбар зрабіла і вядомая беларуская гімнастка і алімпійская чэмпіёнка Святлана Баітава: раман Аляксандра Фадзеева «Маладая гвардыя».

Беларускіх аўтараў узгадаў гісторык, выкладчык Магілёўскага тэхналагічнага ўніверсітэта Ігар Пушкін: яго любімыя кнігі — «Каласы пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча і «Палескія рабінзоны» Янкі Маўра. Маладая магілёўская пісьменніца Алёна Беланожка прызналася, што творы Антуана дэ Сент-Экзюперы прымусілі яе па-іншаму паглядзець на жыццё.

Прадстаўнікі гарадской улады зрабілі свае рэкамендацыі. Старшыня Магілёўскага гарадскога Савета дэпутатаў Фёдар Міхеенка аддаў перавагу творам Рэмарка. Дарэчы, гэтага вядомага нямецкага пісьменніка ўзгадвалі многія ўдзельнікі праекта. Начальнік упраўлення адукацыі гарвыканкама Яўген Дуплеўскі адзначыў любімыя ўсімі творы Ільфа і Пятрова «Дванаццаць крэслаў» і «Залатое цяля»: безумоўна, у нашым жыцці не хапае добрага гумару. Начальнік фінансавага аддзела Магілёўскага гарвыканкама Эльміра Варапаева, нягледзячы на, падавалася б, празаічную працу з грашыма, раіць чытаць усім Амара Хаяма.

У ліку фаварытаў супрацоўнікаў тэлерадыёкампаніі «Магілёў»: «Гордасць і прадузятасць» Джэйн Осцін, «Тры мушкецёры» Аляксандра Дзюма, «Тэатр» Маэма, а таксама вельмі сур'ёзныя творы Аляксандра Салжаніцына і нават (вельмі нечакана!) Мікалай Астроўскі з «Як загартоўвалася сталь».

Расійская пісьменніца Паліна Дашкава, якая прыязджала ў Магілёў на сустрэчу з чытачамі, мяркуе, што кожны чалавек павінен прачытаць у сваім жыцці «Ганну Карэніну» Льва Талстога і «Мёртвыя душы» Мікалая Гогаля.

Дарэчы, многія з рэкамендаваных магілёўцам кніг уваходзяць у вядомы спіс «1001 кніга, якую трэба прачытаць да таго, як памрэш». Гэта вынік выбару міжнароднай групы прызнаных пісьменнікаў, крытыкаў і журналістаў.

У гарадской бібліятэцы любімыя кнігі вядомых людзей Магілёва аформлены ў выставу. Час ад часу наведвальнікі забіраюць кнігі тут жа, з выставачнай паліцы, каб скарыстацца рэкамендацыяй, прачытаць і атрымаць уражанне. Бібліятэкары спадзяюцца, што праект пад дэвізам «Чытай кнігі — станавіся паспяховым чалавекам» прыцягне да чытання новых аматараў.

**Ілона ІВАНОВА.**

Інфарм-укол

# ФІЗКУЛЬТУРА ДЛЯ ТЫХ, КАМУ ЗА...

**Пажылыя людзі нярэдка думаюць, што спорт — не для іх. Нібыта час для заняткаў фізкультурай мінуў. На самай справе менавіта рухальная актыўнасць і фізічныя практыкаванні — самы магутны фактар, які дазваляе супрацьстаяць старэнню. Задача ў гэтым выпадку не ў тым, каб атрымалася «вышэй, далей, хутчэй», а ў прафілактыцы ўзроставых захворванняў і ўмацаванні здароўя.**

Паводле слоў **урача-валеолага Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Ганны РОДЗІЧ,** адэкватныя фізічныя нагрузкі спрыяльна ўздзейнічаюць на стан арганізма ў цэлым. Яны дапамагаюць захаваць і ўмацаваць мышачны тонус, рухавасць суставаў, трываласць і эластычнасць звязак, палепшыць каардынацыю рухаў, падтрымаць фізічную і разумовую працаздольнасць, спрыяюць рацыянальнай рабоце ўсіх сістэм арганізма (сардэчна-сасудзістай, дыхальнай, выдзяляльнай, эндакрыннай, імуннай), стымулююць абмен рэчываў, зніжаюць узровень халестэрыну і цукру ў крыві, змяншаюць рызыку развіцця атэрасклерозу, гіпертанічнай хваробы, цукровага дыябету і іх ускладненняў, здымаюць галаўны боль, галавакружэнне, паляпшаюць сон і настрой.

З-за шэрагу фізіялагічных працэсаў, якія працякаюць у арганізме ў пажылых людзей, варта зніжаць долю сілавых і хуткасна-сілавых практыкаванняў. Супрацьпаказаны спартыўныя гульні з рэзкай зменай сітуацыі, якія патрабуюць хуткага чаргавання скарачэння і расслаблення шкілетных мышцаў. Не рэкамендуюцца і практыкаванні з рэзкай зменай становішча галавы і цела. Пры наяўнасці нейкага захворвання могуць быць яшчэ абсалютныя ці адносныя супрацьпаказанні да фізічных практыкаванняў.

**Людзям старэйшага ўзросту можна рэкамендаваць:**

1. Малаінтэнсіўныя цыклічныя практыкаванні (хада, бег, плаванне, лыжы і інш.). Гэта лёгка выконваецца з тэхнічнага пункту гледжання і даступна шырокаму колу, амаль не мае супрацьпаказанняў.

2. Гімнастычныя практыкаванні на суставы пазваночніка, плечавыя, тазасцегнавыя і галёнкаступнёвыя. Выконваць варта без абцяжарвання, з разгрузкай суставаў, але са шматразовымі паўторамі.

3. Гігіенічная гімнастыка, якую можна праводзіць 2-3 разы на працягу дня, па 7-10 хвілін. Кожны сеанс такой гімнастыкі можа быць прысвечаны нейкай адной або некалькім групам практыкаванняў.

Аптымальны варыянт выканання фізічных практыкаванняў — калі пульс не перавышае 120-150 удараў у хвіліну, працягласць — 40-60 хвілін, з частатой 3-5 разоў на тыдзень. Пачашчанае дыханне і лёгкая задышка з'яўляюцца паказчыкам трэніровачнага эфекту. Пры фізічнай нагрузцы павінна захоўвацца здольнасць размаўляць. Аднаўленне пульсу і дыхання займае ў норме 5-10 хвілін.

Пры перадазіроўцы фізічнай нагрузкі мышцы сэрца недастаткова забяспечваюцца кіслародам. Прыкметамі празмернай фізічнай нагрузкі з'яўляюцца боль за грудзінай, парушэнне сардэчнага рытму, павелічэнне пульсу звыш 150 за хвіліну, узнікненне неабходнасці рабіць удых праз рот падчас нагрузкі.



Адначасова з фізічнымі практыкаваннямі пажылым не трэба забывацца на паветраныя і сонечныя ванны, водныя працэдуры.

Калі вы самі не можаце правільна падабраць фізічную нагрузку, неабходна звярнуцца па кансультацыю да ўрача. Пры жаданні можна наведваць заняткі ў групах здароўя, якія працуюць у аддзяленнях лячэбнай фізкультуры паліклінік або ў фізкультурна-аздараўленчых комплексах.

